

ТАЙНЫ ВЫШЫНІ

МС

ЯК СПЫНІЦЬ ЦУКРОВЫ ДЫЯБЕТ

12




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

7 ЧЭРВЕНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 107 (29987)



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


## КОРАТКА

• **Аляксандр Лукашэнка адобрыў праект пагаднення аб свабодным гандлі паслугамі і ажыццяўленні інвестыцый у СНД.**

• Гандлёвую пляцоўку для рэалізацыі прадукцыі лясгасаў адкрылі ў Бабруйску.

• **Продажы новых аўтамабіляў у Беларусі ў маі выраслі больш як у два разы.**

• У гэтым годзе ва ўстановы вышэйшай адукацыі ў цэлым плануецца прыняць больш за 50 тысяч чалавек.

• **Беларусь займае другое месца па лясістасці сярод краін СНД.**

• Абласныя туры сямейнага сельгаспраекта «Уладар вёскі» стартуюць 16 чэрвеня.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр КУЛІК, міністр лясной гаспадаркі:**

*«Задача па насычэнні ўнутранага рынку прадукцыяй лесаперапрацоўкі, пастаўленая кіраўніком дзяржавы і прэм'ер-міністрам, стала вызначальнай у развіцці гандлёвай сеткі. Мы ўзялі на сябе гэтае абавязацельства і паспяхова яго выконваем. Адкрылася ўжо 13-я гандлёвая пляцоўка ў краіне. Самая галоўная задача — асартымент. Грамадзянін, які едзе на дачу, павінен мець магчымасць набыць усе асноўныя драўляныя канструкцыі ў адным месцы. Мы павінны таксама прапанаваць комплекс спадарожных тавараў і паслуг».*

З першых вуснаў

# «МАЁ ГАЛОЎНАЕ ПАТРАБАВАННЕ — ГЭТА СПРАВЯДЛІВАЕ СТАЎЛЕННЕ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па балючых пытаннях уступнай кампаніі, з-за якіх на мінулым тыдні ўзнялася «цэлая буча». Нагадаем, на мінулым тыдні падчас кадравых прызначэнняў кіраўнік дзяржавы пракаментаваў сітуацыю з цэнтралізаваным экзаменам і раскрытыкаваў сістэму падліку балаў. Усё пачалося з таго, што пасля правядзення ЦЭ па беларускай і рускай мовах сталі паступаць шматлікія звароты ад дзяцей і бацькоў з просьбай растлумачыць, чаму атрыманы бал у некаторых выпадках ніжэйшы, чым падчас рэпетыцыйнага экзамену. Прэзідэнтам была пастаўлена задача праверыць арганізацыю цэнтралізаваных экзаменаў і ўдакладніць атрыманыя вынікі. У той жа дзень, 30 мая, была сфарміравана міжведамасная камісія для праверкі карэктнасці апрацоўкі вынікаў першага цэнтралізаванага экзамену. Па выніках яе работы 2 чэрвеня Міністэрства адукацыі паведаміла, што вынікі першага цэнтралізаванага экзамену пералічаць па новай методыцы.**

СТАР. 2



Фота БелТА.

Падзея

# Аснова харчовай бяспекі




Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Учора ў Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень» адкрылася 33-я Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «Белагра-2023»**

**Беларусь адкрыта для супрацоўніцтва з усімі краінамі — удзельніцамі выстаўкі «Белагра-2023», заявіў намеснік прэм'ер-міністра Леанід ЗАЯЦ падчас старту Беларускага аграпрамысловага тыдня.**

СТАР. 5

Дзяржаўны інтарэс

# ЧАС МАГЧЫМАСЦЯЎ

## Чым жыве айчынная лёгкая прамысловасць?

**Тэма лёгкай прамысловасці выйшла на першы план у апошнія гады ў сувязі з сыходам з беларускага і расійскага рынкаў замежных брэндаў, якія належаць да адзежнага рытэйлу, вытворчасці тавараў для дома, галантарэі і г. д. І хоць сёння замежныя кампаніі паступова вяртаюцца на наш і расійскі рынак (або думаюць пра гэта), беларускія вытворцы досыць паспяхова запаўняюць нішы, якія вызваліліся. Для гэтага ў іх ёсць і магчымасці, і тэхналогіі, і крэатыў.**

СТАР. 4


ISSN 1990 — 763X
23107>
9 771990 763008



ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «МАЁ ГАЛОЎНАЕ ПАТРАБАВАННЕ — ГЭТА СПРАВЯДЛІВАЕ СТАЎЛЕННЕ»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Аднак учарашняя нарада на найвышэйшым узроўні была сабрана не для «разбору палётаў». «Я не хачу слухаць даклады і разбірацца ў нейкай бязладзіцы ўступных іспытаў, асабліва па тых скаргах, якія былі пасля здачы цэнтралізаванага экзамену. Цэнтралізаванае тэсціраванне, цэнтралізаваны экзамен — нахамуталі далей няма куды. Пытанне не ў гэтым, хоць пра гэта мы таксама пагаворым. Але мяне больш цікавіць, як будзем далей жыць. Гэту праблему мы вырашылі. Людзі разумеюць, як мы балы гэтыя лічым, пераводзім — не пераводзім. Зрабілі сістэму больш зразумелай», — задаў тон нарады Прэзідэнт. Па яго словах, правядзенне цэнтралізаванага экзамену і падлік балаў — вельмі важнае пытанне. Але пытанне не толькі ў гэтым. «Важна, як мы будзем далей ажыццяўляць набор у ВНУ нашай моладзі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У ліку ўдзельнікаў мерапрыемства — міністр адукацыі Андрэй Іванец, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка, намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Васіль Герасімаў, дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Юрый Міксюк, прадстаўнікі профільных камісій абедзвюх палат парламента, а таксама кіраўнікі ўстаноў адукацыі рознага ўзроўню.

«Для чалавека самае галоўнае — гэта здароўе і адукацыя. Няма здароўя, няма адукацыі, няма чалавека. У гэтым аснова маіх перажыванняў па сістэмах аховы здароўя і адукацыі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў пра нядаўнюю нараду па пытаннях сістэмы аховы здароўя, дзе былі вызначаны самыя праблемныя пытанні, пастаўлены канкрэтныя задачы па іх вырашэнні і акрэслены канкрэтны тэрмін выканання даручэнняў. «Да 1 студзеня ахова здароўя павінна прыйсці ў прытомнасць. Пакуль я не бачу, каб там на поўную моц разгарнуліся і выконваліся гэтыя пытанні. Але я хачу, Ігар Віктаравіч (Петрышэнка — намеснік прэм'ер-міністра, — **«Зв.»**), вас і прэм'ера папярэдзіць: глядзіце, каб не было балюча. Мы кантралюем выкананне маіх даручэнняў. І ніхто сёння моцна не разгарнуўся. Я вам раю пачаць выконваць мае даручэнні па ахове здароўя», — заўважыў Прэзідэнт. Ён папярэдзіў, што такі ж глыбокі аналіз, як у сістэме аховы здароўя, чакае і сістэму адукацыі. І паступленне моладзі ў ВНУ будзе першым пытаннем да сістэмы адукацыі.

### Тэхнічнага збою не было, патрабавалася зразумелая сістэма

Што да сітуацыі з падлікам балаў цэнтралізаванага экзамену, кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ім былі дадзены даручэнні кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта Ігару Сергеенку дасканала разабрацца ў ацэньванні вынікаў тэсціравання. Праверка паказала, што тэхнічнага збою не было, сістэма падліку балаў, якая прымяняецца на цэнтралізаваным тэсціраванні з 2019 года, спрацавала правільна. «І я не падвяргаю сумненню тое, як вы там лічылі. Мае прэтэнзіі ў тым, што людзі вас не разумеюць. Ні будучыя студэнты, абітурыенты, ні бацькі, ні іншыя людзі не разумеюць, што вы там нахамуталі, што вы прыдумалі. Ну няўжо нельга было стварыць дакладную зразумелую простую сістэму? Пагладзелі бацькі: «А, зразумела. 10 балаў», іншы паглядзеў — 8 балаў і гэтак далей. А вы пачалі там... Я не кажу, што гэта была няправільная сістэма, але занадта разумная. Вы яе стварылі самі для сябе», — адзначыў Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што былі разбежкі, нестыкоўкі паміж вынікамі рэпетыцыйнага тэсціравання і цэнтралізаваным экзаменам. «Людзі ж супаставілі і бачаць, што хлопец ці дзяўчына, якія атрымалі больш балаў, апынуліся ў горшым становішчы або як там было. Патрабавалася звычайная нармальная дакладная сістэма», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

### Да 2024 года жалезабетонна вызначыцца з сістэмай паступлення

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што адным з пытанняў да сістэмы адукацыі стане мэтазгоднасць таго, што ў школе адмянілі выпускныя экзамены. «Я як былы настаўнік разумею, што экзамен у школе — гэта вянец усяму. Ішлі як на свята, настаўнікі задаволеныя. Я прымаў экзамен. Нічога дрэннага там не было», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што раней у школах было больш выпускных экзаменаў, потым сталі спрашчацца — праводзілі чатыры экзамены. «А потым дайшлі да таго, што не трэба ў школах экзамены. Мы здаём адзіны іспыт цэнтралізаваны — ён і туды і сюды. Я не знаходжу нічога станоўчага. Мы ліквідавалі самы галоўны вынік працы ў школах, вянец гэтага і павезлі дзяцей у нейкія зборна-прыёмныя пункты здаваць цэнтралізаваны экзамен. Само па форме неяк не вельмі», — сказаў ён. Прэзідэнт упэўнены, што дзеці, здаючы школьны экзамен, трэніруючыя і рыхтуюцца здаваць іспыты ў ВНУ, больш сур'ёзныя. «І потым, калі ты 11 гадоў нармальна вучыўся, то здасі экзамен у школе», — дадаў ён.

Адным з аргументаў на карысць цэнтралізаванага экзамену і яго перавагамі перад школьнымі выпускнымі экзаменамі было забеспячэнне аб'ектыўнасці ў адзнаках, немагчымасць «падагнаць» адзнаку. Але, як звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, вынікі цэнтралізаванага экзамену суадносяцца і супадаюць з вынікамі экзамену ў школе. «Дык навошта са школы забіралі экзамены?» — задаў пытанне Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што неабходна вызначыцца, як будуць падводзіцца вынікі сярэдняй адукацыі ў школах, якія экзамены будуць здаваць выпускнікі. «Пры паступленні ў ВНУ мы павінны вызначыцца: ці пойдзем шляхам зноў цэнтралізаванага тэсціравання, калі сядзяць і тыкаюць пальцам у неба, або будзем здаваць іспыты, шляхам сумоўя, выкарыстоўваючы тую сістэму, якая добра сябе зарэкамендавала? Ці гэта будзе нейкі сімбіёз, сумесь таго і другога? Мы павінны дакладна вызначыцца, гэта не для гэтага года. Але для наступнага — жалезабетонна», — канстатаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы зноў анансаваў правядзенне вялікай нарады па заяўленай тэматыцы па аналогіі з тым, як гэта было нядаўна па рабоце сістэмы аховы здароўя. Асноўным пытаннем будзе правядзенне ўступнай кампаніі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пры яго абмеркаванні хацеў бы пачуць розныя, няхай нават палярныя пункты гледжання спецыялістаў, каб на іх аснове можна было выпрацаваць узважанае рашэнне. «Нам трэба канчаткова вызначыцца, каб гэта было зразумела бацькам, зразумела абітурыентам будучым. І каб грамадства нас разумела», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Пытанне адукацыі ён назваў найважнейшым, без якога не можа быць краіны.

«Падкрэслю, памылак ці, не дай бог, злоўжыванняў, быць не павінна. Вы маю пазіцыю ведаеце: павінна быць справядліва і зразумела для людзей», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым, па яго словах, не трэба баяцца прызнаваць памылкі, калі яны ёсць. Трэба іх своечасова выпраўляць, а хавацца і нечага баяцца не трэба.

«Яшчэ раз паўтараю. Маё галоўнае патрабаванне — гэта справядлівае стаўленне. І асабліва справядлівасць пры здачы экзаменаў. Гэта маладыя людзі, будучая эліта, будучыя кіраўнікі нашай краіны. Яны робяць першы рашучы свядомы крок у нармальнае жыццё. І гэты крок павінен быць без усялякіх праблем і падазрэнняў», — папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён нагадаў, што на нарадах, калі новая сістэма ўступных кампаній абмяркоўвалася, на пытанні Прэзідэнта, ці добрая гэта сістэма, спецыялісты запэўнівалі, што ўсё нармальна. «Аказваецца, ненармальна — куча пытанняў. Але калі ёсць пытанні, іх трэба здымаць, іх трэба вырашаць», — заўважыў ён. Вырашэнне гэтых пытанняў будзе прааналізавана на вялікай нарадзе, прысвечанай сістэме адукацыі.

Прэзідэнт нагадаў адказным асобам пра неабходнасць кантролю за якасцю школьных падручнікаў: «Не забывайце пра падручнікі. Галоўнае ў школе — гэта падручнікі. Усе задачы некалькі гадоў таму былі пастаўлены. Вывучыце разам з Камітэтам дзяржаўнага кантролю, як вырашаецца гэта праблема».

Асобна кіраўнік дзяржавы звярнуўся да старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігара Карпенкі, які працаваў міністрам адукацыі да назначэння на гэтую пасаду Андрэя Іванца. «Ты ўчарашні міністр адукацыі. Табе было даручэнне — знаходзіцца год-два побач з міністрам, унікаць у гэтую сістэму і выказваць свой пункт гледжання і пазіцыю. Пакуль я не бачу тваёй пазіцыі. Таму далучайся. Ты ўсё жыццё ў адукацыі. І ў цябе ёсць людзі, якія многае могуць падказаць, параіць. Трэба прыцягваць, акумуляваць іх меркаванні і таксама ўносіць прапановы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### Мэтавікі павінны разумець, што ім прыйдзецца адпрацаваць пэўны час

Таксама Прэзідэнт звярнуў увагу на набор абітурыентаў на мэтавую форму падрыхтоўкі. «Я хачу папярэдзіць па мэтавіках: людзі павінны разумець, што яны атрымліваюць адукацыю і вяртаюцца на канкрэтнае месца работы. Замуж, не замуж — усё роўна адпрацаваць трэба. Вядома, мы па-чалавечы будзем падыходзіць. Але мэтавікі павінны дакладна разумець, што ім давядзецца, паводле дамоўленасці, адпрацаваць пэўны час. І гэты час павінен быць салідным. Не два-тры гады, а мінімум пяць», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што да мэтавікаў будуць падыходзіць па-чалавечы і таму магчымы выключэнні, але ў адзінкавых выпадках.

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў удзяліць мэтаваму набору сур'ёзную ўвагу: «Ад гэтага мы нікуды не сыдзем, таму што нам патрэбны і настаўнікі, і ўрачы, і аграномы, і заатэхнікі на канкрэтным месцы ў канкрэтным рэгіёне. І людзі, якія жадаюць паступаць у ВНУ і несці абавязацельствы па мэтавым прызначэнні, ёсць. Іх хапае, таму трэба падтрымліваць. У асноўным гэта дастойныя людзі, якія ідуць і працуюць», — адзначыў ён.

Міністр адукацыі Андрэй Іванец пракаментаваў, што менавіта такіх падыходаў і прытрымліваюцца пры правядзенні ўступнай кампаніі. «Мэтавікам павінен быць не толькі матываваны, але і падрыхтаваны абітурыент», — сказаў ён. Міністр далажыў, што 5 чэрвеня завяршыўся прыём дакументаў на мэтавае навучанне ў ВНУ. Каля 4,7 тысячы абітурыентаў захацелі стаць мэтавікамі. З 6 да 13 чэрвеня іх чакае ўсяго адзін унутраны іспыт па першым профільным прадмеце ў ВНУ ў вуснай ці пісьмовай форме. Залічаць ва ўніверсітэты мэтавікаў да 16 чэрвеня. У кожную прыёмную камісію ўключаны настаўнік-прадметнік. Гэта важнейшы аспект, таму што ў прафесара могуць быць завышаныя патрабаванні да абітурыентаў, адзначыў міністр адукацыі. Забяспечаны камфортныя ўмовы, каб абітурыенты не чакалі некалькі гадзін пад дзвярыма. «Ужо на працягу гэтага тыдня мы ўбачым вынікі прыёму вуснага экзамену і зможам зрабіць прапановы па далейшым удасканаленні гэтага кірунку прыёму дакументаў», — сказаў Андрэй Іванец. Ён таксама расказаў, што існуе толькі тры падставы для таго, каб мэтавік пераразмеркаваўся: стан здароўя, рэгістрацыя шлюбу і выпадак, калі прадпрыемства, якое заказвала мэтавага абітурыента, перастала існаваць. Прычым пераразмеркавацца такі спецыяліст можа толькі па ўзгадненні з мясцовымі органамі ўлады.

### Дзяржава зацікаўлена ў тым, каб рыхтаваць спецыялістаў

Міністр расказаў, што сёлета ва ўстановы вышэйшай адукацыі ў цэлым плануецца прыняць больш як 50 тысяч чалавек. З іх 28,4 тысячы — на бюджэтныя месцы. «Хацеў бы падкрэсліць, што гэта павелічэнне на 600 месцаў. Сёння дзяржава зацікаўлена ў тым, каб рыхтаваць спецыялістаў. Мы з'яўляемся сацыяльна арыентаванай дзяржавай і забяспечым неабходныя ўмовы», — сказаў Андрэй Іванец. Набор на платную форму навучання ў ВНУ скарочаны на 1,5 тысячы чалавек, сёлета ён складзе 23,5 тысячы. Але пры гэтым мы на тысячу месцаў павялічылі прыём у каледжы на бясплатную форму навучання. «Калі малады чалавек хацеў паступіць ва ўніверсітэт на платнае, мы сёння даём магчымасць паступіць у каледж. Пасля каледжа — калі ласка, паступай ва ўніверсітэт», — падкрэсліў міністр адукацыі. Сярод новаўвядзенняў — і зніжэнне набору ў сталічныя ВНУ. Ён скарацііўся больш як на 500 месцаў. Аднак разам з тым на 10 працэнтаў павялічаны набор на медыцынскія спецыяльнасці, на 4,5 працэнта — на педагагічныя.

Што да цэнтралізаванага экзамену, яго Андрэй Іванец назваў у першую чаргу формай выніковай атэстацыі за курс сярэдняй школы. Па яго словах, ЦЭ дазваляе фактычна ўбачыць зрэз ведаў кожнага выпускніка. «І гэта для нас вельмі сур'ёзны і важны інструмент кіравання сістэмай школьнай адукацыі. Для нас гэты інструмент выразна адказаў на тры пытанні: чаму вучым, як вучым і хто вучыць», — расказаў міністр адукацыі. «Усе звароты, якія паступілі ад грамадзян, у пераважнай большасці датычыліся аднаго пытання: як падлічваліся балы. Скаргаў на складанасць заданняў не паступіла», — дадаў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

❍ **У тэму**

### Сістэма адукацыі павінна быць зразумелай

У размове з журналістамі **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ** расказаў, што Прэзідэнтам пастаўлена дакладная, зразумелая задача правесці гэту ўступную кампанію па тых правілах, якія былі ў мінулым годзе вызначаны, даведзены да грамадскасці. Восенню Міністэрства адукацыі прааналізуе вынікі ўступнай кампаніі, і па выніках будзе прынята рашэнне, у якім напрамку рухацца далей.

«Тая колькасць навацый, якую сёлета мы апрабуем, гэта не толькі пытанне правядзення цэнтралізаванага экзамену, а яшчэ асаблівы парадак прыёму мэтавікаў (калі яны здаюць унутраны вусны экзамен), пашыраны набор адораных, таленавітых абітурыентаў, якія з'яўляюцца пераможцамі не толькі рэспубліканскіх, міжнародных прадметных алімпіяд, але і ўніверсітэцкіх (прайшлі ва ўсіх рэгіянальных ВНУ), гэта выпускнікі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, вядома, патрабуе сур'ёзнага аналізу», — адзначыў Андрэй Іванец.

«Прэзідэнт даў усім дакладны і ясны пасыл: сістэма адукацыі павінна быць зразумелай, празрыстай, прынцыпы справядлівасці і роўных умоў павінны быць вытрыманы для ўсіх: і для навучэнцаў, і для бацькоў», — падкрэсліў міністр.

# «Цэнтр цяжару эканомікі Беларусі і Расіі зрушыўся на Усход»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Прыморскага краю Алегам Кажамякам. Дэлегацыя рэгіёна гэтымі днямі з рабочым візітам наведвае Беларусь.**

«Удзячны не толькі за тое, што вы прыязджаеце ў Беларусь. Але і ў сродках масавай інфармацыі адсочваю вашы заявы, падтрымку Беларусі і беларускіх тавараў, прадукцыі, якую мы вырабляем, вашу зацікаўленасць у Прымор'і ў набыцці нашай прадукцыі. Ну і чаго ўтойваць, вашы выказванні, добрыя станоўчыя водгукі ў адрас нашай эканомікі маюць добры водгук у вашых калег на Далёкім Усходзе», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што з Далёкім Усходам беларусы заўсёды гатовы развіваць супрацоўніцтва.

«Вядома, адлегласць накладвае пэўны адбітак. І нават не адлегласць, а загружанасць чыгунак, якія сёння ёсць у напрамку Байкал—Амурск і іншых ва ўсходнім напрамку, паколькі цэнтр цяжару эканомікі Беларусі і Расіі зрушыўся на Усход. І вы як ніколі запатрабаваны. І гэта добра. Але тое, што чыгункі не спраўляюцца з гэтым патокам, — факт, і тут нам трэба працаваць разам, каб пашырыць гэтыя вузкія месцы», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі добра ведаюць, у чым мае патрэбу Прыморскі край. Па яго словах, вельмі добра, што дэлегацыя рэгіёна пабудзе на выстаўцы «Белагра», наведае Гомель, убачыць найлепшыя прадпрыемствы.

«Словам, мы да вашых паслуг. Калі тое трэба, мы, як заўсёды, да гэтага далучымся і будзем у гэтым кірунку працаваць. Вы кажыце, што вам трэба, не чужы чалавек. І спецыфічныя пытанні, калі трэба нейкія ў плане аграрна-прамысловага комплексу. Абсалютна няма ніякіх закрытых тэм. Мы нікога не баімся. Усё, што ў нас ёсць, да вашых паслуг. Заўсёды дапамагалі, адгукаліся на вашы просьбы і запыты. Так будзе і надалей», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Па словах Алега Кажамякі, на «Белагра» заўсёды прыязджае вялікая дэлегацыя Прыморскага краю: прадстаўнікі бізнесу, прадстаўнікі розных міністэрстваў. Ужо заключаюцца пагадненні, кантракты па розных кірунках дзейнасці. «Мы бачым, што гэта супрацоўніцтва дае ўзаемавыгадны плён. Так што з 2019 года ў нас тавараабарот павялічыўся ў шэсць разоў, цяпер ужо дасягае 7,6 мільярда рублёў. У 2019 годзе гэта было каля 400 мільёнаў», — расказаў губернатар.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### ❍ У тэму

### У гандлёва-эканамічным плане мы бачым рост

У размове з журналістамі Алег Кажамяка расказаў, што аснову тавараабароту паміж Беларуссю і Прыморскім краем складае беларуская прадукцыя харчовай прамысловасці. Па яго словах, беларускія прадукты ў рэгіёне паважаюць. Традыцыйна значную частку тавараабароту складае прадукцыя машынабудавання, папулярныя вырабы Мінскага трактарнага завода, МАЗа, «Амкадора». «Гэту тэхніку высока цэняць нашы дарожнікі, камунальнікі. У Прымор'і створаны цэнтры па сэрвісным абслугоўванні, па падрыхтоўцы механізатараў. Гэта такі вялікі аспект, які заўсёды служыць нам у дапамогу. Цяпер вялікім попытам карыстаюцца МАЗы «MAN». Мы плануем закупляць аўтобусы, сталі ў чаргу, таму што шмат заказаў у рэспубліцы. Спадзяюся, што з улікам нашых сяброўскіх адносін усё своечасова адгрузім», — расказаў Алег Кажамяка. Па яго словах, супрацоўніцтва пашыраецца і праз пастаўкі з Прыморскага краю. У Беларусь ідзе борная кіслата на «Полацкшкловалакно», павялічаны пастаўкі морапрадуктаў.

«Цяпер у нас стаяць задачы па прадстаўленні беларускай тэхнікі на нашых пляцоўках, першыя 45 адзінак ужо знаходзяцца там. Нам падабаюцца камбайны «Палессе», якія адпавядаюць сусветным стандартам. Мы зацікаўлены ў стварэнні сумесных вытворчасцей, у тым ліку па перапрацоўцы малочнай прадукцыі. Мы гэта разглядаем у тым ліку і з нашымі кітайскімі партнёрамі. У Беларусі з Кітаем добрыя адносіны, і Прымор'е — гэта якраз той мост, праз які наладжваюцца ўсе гэтыя сувязі. У гандлёва-эканамічным плане мы бачым рост», — падкрэсліў Алег Кажамяка. Пры гэтым ён звярнуў увагу, што не застаюцца незаўважанымі і сацыяльныя праекты. Падчас свайго візіту ў Беларусь Алег Кажамяка таксама сустрэўся з прэзідэнтам Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі Віктарам Лукашэнкам. Яны абмеркавалі магчымасць удзелу беларускай дэлегацыі ў I летніх міжнародных спартыўных гульнях «Дзеці Прымор'я», якія пройдуць з 1 да 6 ліпеня бягучага года.

«Мы ў сваю чаргу адправім сюды нашых дзяцей, якія наведаюць такія свяшчэнныя месцы, як Хатынь, Брэсцкая крэпасць, Буйніцкае поле, каб разумелі, што такое Вялікая Айчынная вайна і чаму гэта вельмі важна памятаць», — адзначыў губернатар Прыморскага краю.

Падчас свайго візіту ў Беларусь Алег Кажамяка правёў перагаворы з намеснікам прэм'ер-міністра Беларусі Леанідам Зайцам. Расійская дэлегацыя наведала ААТ «Мінскі механічны завод імя С. І. Вавілава — УКХ «БелОМА», ААТ «Агат-сістэм», ДУ «Шматпрофільны культурна-спартыўны комплекс» «Мінск-Арэна». Дэлегацыя Прыморскага краю таксама наведае Гомель. У графіку Алега Кажамякі — сустрэча з яго гомельскім калегам Іванам Крупко, а таксама наведванне шэрагу буйных прадпрыемстваў, сярод якіх ААТ «Гомельдрэў», СП ААТ «Спартак», ААТ «Гомсельмаш».

## Парламенцкі дзень

# ВЯЛІКІ ПАТЭНЦЫЯЛ ДРУЖБЫ І ЎЗАЕМНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

### У Палаце прадстаўнікоў адбылося пасяджэнне Міжпарламенцкай камісіі па супрацоўніцтве Нацыянальных сходаў Беларусі і Арменіі

**Мерапрыемства стала вынікам папярэдніх дамоўленасцяў Міжпарламенцкай камісіі ў Ерэване ў верасні 2019 года і накіравана на далейшае паглыбленне беларуска-армянскіх міжпарламенцкіх кантактаў. Правядзенне трынаццатага пасяджэння Міжпарламенцкай камісіі ў Мінску з'яўляецца важным крокам у справе далейшага ўмацавання партнёрства Беларусі і Арменіі.**

Падчас сустрэчы бакі абмеркавалі актуальныя пытанні глабальнага стану міжнародных адносін, гандлёва-эканамічнае ўзаемадзеянне паміж Беларуссю і Арменіяй з улікам членства і ўзаемадзеяння ў ЕАЭС, а таксама пытанні пашырэння культурна-гуманітарнага супрацоўніцтва, у тым ліку ў сферы навукі і адукацыі.

Як адзначыў **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў, сустаршыня Міжпарламенцкай камісіі па супрацоўніцтве Нацыянальнага сходу Беларусі і Нацыянальнага сходу Арменіі Валерый МІЦКЕВІЧ,** парламентарыі намецілі планы на будучыню, прынялі і адобрылі ўсе запланаваныя рашэнні, якія былі падрыхтаваны загадзя. «Мы ўпэўнены, што інтэнсіфікуем нашы міжпарламенцкія сувязі на карысць нашых краін і народаў», — падкрэсліў ён.

Кажучы аб канкрэтных пытаннях, якія закраналіся на пасяджэнні, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў паведаміў, што абмяркоўвалася ўнутрыпалітычная і знешнепалітычная абстаноўка, эканамічныя, культурныя, навуковыя сувязі і магчымасці іх пашырэння, а таксама роля парламентарыяў у гэтым.

«Сам факт таго, што сёння адбылося чарговае пасяджэнне пасля перапынку па аб'ектыўных прычынах, ужо сведчыць аб імкненні, жаданні і неабходнасці таго, каб міжпарламенцкае вымярэнне паміж Арменіяй і Беларуссю пачало больш актыўна функцыянаваць і развівацца, — заўважыў **член Пастаяннай камісіі Нацыянальнага сходу Арменіі па еўрапейскай інтэграцыі, сустаршыня Міжпарламенцкай камісіі па супрацоўніцтве Нацыянальнага сходу Арменіі і Нацыянальнага сходу Беларусі Армен ГЕВАРГЯН**. — Адносіны паміж нашымі краінамі маюць пазітыўны характар, чаму ў многім садзейнічае наша агульнае членства ў шэрагу інтэграцыйных праектаў. Але гэтыя адносіны пакуль далёкія ад ажыццяўлення ўсяго патэнцыялу дружбы і ўзаемнага супрацоўніцтва з-за пэўнай інертнасці і адсутнасці ініцыятыўнасці ў плоскасці двухбаковых адносін».

Парламентарый звярнуў увагу на тое, што пасяджэнне праходзіць напярэдадні 30-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Арменіяй. І гэтая знамянальная дата, па яго словах, — добрая нагода асэнсаваць пройдзеныя сумесны шлях развіцця дзвюх незалежных дзяржаў, а таксама надаць вялікі дынамізм і крэатыўнасць двухбаковым адносінам.

**Паводле БелТА.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | |
|---|---|---|
| Продавец | ОАО «Сукно», г. Минск, ул. Матусевича, д. 33, Тел. +375 (17) 363-99-40 | |
| **Извещение о проведении открытого аукциона** | **Дата, время проведения аукциона** | **Срок подачи заявления на участие в торгах** |
| **Предмет аукциона:** изолированные помещения, реализуемые одним лотом, по адресу: г. Минск, ул. Матусевича, 33/1-1, 33/1-2, 33/1-3. **Начальная цена (без НДС): 1 614 400,00 бел. руб.** Подробная информация на сайте организатора аукциона www.cpo.by | **22.06.2023 в 14.00** | **с 9.00 07.06.2023 до 17.00 21.06.2023** |

**Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** Лица, желающие принять участие в аукционе, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390

**Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов аукциона определяются ст. ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»**

| Срок подписания договора купли-продажи | **5 (пять) рабочих дней** после проведения аукциона |
|---|---|

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **15 (пятнадцати) дней** со дня проведения аукциона, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо претендент на покупку обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 2 % от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов не менее, чем за день до наступления даты проведения торгов без объяснения причин снятия

| Контактные данные | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |
|---|---|



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
|---|---|
| Продавец | ОАО «Управление механизации № 91», 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11/7 |
| Оператор/ адрес ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. **www.ipmtorgi.by** |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Административное помещение** (39,9 кв. м, инв. номер 500/D-708004811), по адресу: **г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 7** | **159 840,00** (снижена на 10 %) |
| 2 | **Административное помещение** (61,6 кв. м, инв. номер 500/D-708004812), по адресу: **г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, пом. 7А** | **246 240,00** (снижена на 10 %) |

**Обременение по лотам №№ 1-2:** изолированные помещения расположены в капитальном строении, которое является памятником историко-культурного наследия; запрет на совершение регистрационных действий

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона по всем лотам

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи. Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права собственности на предмет аукциона несутся покупателем

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Продавец гарантирует, что запрет совершать регистрационные действия, наложенный органом принудительного исполнения, будет снят после проведения аукциона и не повлияет на результаты аукциона

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты продавцу за проведение независимой оценки и затраты организатору торгов на их проведение, также оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **5 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газета «Звязда» от 24.03.2023

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 21.06.2023 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 20.06.2023 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

# ЧАС МАГЧЫМАСЦЯЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Апошнія гады, пачынаючы з 2020-га, унеслі навеўвядзенні, драйв, выклікі, праз якія даводзілася праходзіць прадпрыемствам галіны: выбудоўваць новыя сістэмы каардынат як унутры рынку, так і — асабліва — на знешніх контурах, — адзначыла на прэс-канферэнцыі напярэдадні Дня работнікаў лёгкай прамысловасці **старшыня Беларускага дзяржаўнага канцэрна па вытворчасці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці Таццяна ЛУГІНА.** — Геапалітычная сітуацыя стварыла перадумовы для наватарства, каб стабілізаваць сітуацыю і знайсці новыя рынкі рэалізацыі прадукцыі. І большасць прадпрыемстваў паспяхова справілася з гэтай задачай.

Сёння галіна бачыць сваё развіццё ў супрацоўніцтве з рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі, адзначыла Таццяна Лугіна. У канцэрна ў Расіі ўжо рэалізаваны шэраг паспяховых праектаў, ёсць тыя планы, якія будуць выкананы да канца бягучага года, і тыя, што разлічаны на найбліжэйшыя тры гады — усе яны звязаны з засваеннем беларускімі таварамі новых рэгіёнаў і пошукам новых пакупнікоў, падкрэсліла кіраўнік «Беллегпрама».

## ЯКАСЦЬ ЯК БРЭНД

На расійскім рынку беларускія кампаніі прысутнічаюць даўно, але цяпер яны замяшчаюць нішы, якія засталіся пасля сыходу менавіта еўрапейскіх вытворцаў, — а значыць, і параўноўвае іх падсвядома пакупнік менавіта з вядучымі сусветнымі брэндамі. Беларуская якасць — таксама свайго роду прызнаны брэнд. Таму адзенне і абутак, галантарэя, тканіны і тавары для дома з Беларусі карыстаюцца заслужаным даверам расійскіх пакупнікоў. У мінулым годзе прадукцыя лёгкай прамысловасці Беларусі пастаўлялася ў 71 расійскі рэгіён, а ў 65 з іх аб'ёмы паставак выраслі ў параўнанні з узроўнем пазамінулага года: у цэлым, у мінулым годзе тэмп росту склаў 130 %. Вядзецца работа па пашырэнні тавараправоднай і рознічнай сетак. Сярод буйных праектаў — гандлёвая прастора «Бел.ру». У снежні 2022 года першая крама «Бел.ру» расчыніла дзверы для пакупнікоў у Маскоўскай вобласці. А ўвогуле, праект уключае ў сябе шэраг крам і аднайменную інтэрнэт-пляцоўку. Яны прадстаўляць найшырэйшы асартымент тавараў беларускага легпрама (посуд, лазневыя прылады, дамашняе адзенне і тэкстыль, панчошна-шкарпэтачная група і г. д.), а таксама тавары дрэваапрацоўкі, пластмасавыя вырабы і неверагодна папулярную ў расіян беларускую касметыку. Пакуль крам «Бел.ру» дзве: адна — у Хімках і яшчэ адна — на другім паверсе «Кунцэва-Плаза», на тэрыторыі, якую раней займаў брэнд «Zara Home».

— Фармат прыйшоўся да душы пакупнікам, — канстатуе Таццяна Лугіна. — Сёлета плануем адкрыць яшчэ адзін такі гандлёвы пункт у Маскве і два — у Ніжагародскай вобласці.

Высока ацэнены пакупнікамі такі праект «Беллегпрама», як прастора «Дадому». Пакуль што працуе адна крама сеткі, у нашай краіне (у «Dana Mall»), і гэтым летам другая пляцоўка «Дадому» адкрыецца ў ГЦ «Сталіца». А ў найбліжэйшай перспектыве брэнд «Дадому» з'явіцца і ў суседняй Расіі.

— Планаў вельмі шмат. Цяпер складаны, турбулентны час, час хуткіх рашэнняў, але ён дае і магчымасці. У гэтым моманце трэба карыстацца той магчымасцю, якую дае расійскі рынак, — падкрэсліла Таццяна Лугіна. — Кіраўніцтва канцэрна і шэраг прадпрыемстваў выразна разумеюць, што калі сёння мы не распачнём хуткіх і ў нейкай меры агрэсіўных маркетынгавых і камерцыйных бізнес-ходаў на рынку РФ — праз розныя праекты, развіццё каналаў збыту, — то безумоўна, такая ёмістасць рынку будзе замешчана. Туды прыйдуць узбекскія, кітайскія, турэцкія калегі. Таму мы стараемся працаваць інтэнсіўна, і пэўныя поспехі ёсць. Але гэта толькі першыя крокі да тых мэт і задач, якія стаяць перад галінай.

## ДАЛЁКІЯ РУБЯЖЫ

Асваенне далёкіх рэгіёнаў Расіі — адзін з прыярытэтных кірункаў для вытворцаў беларускага легпрама. Нядаўна беларускія тавары лёгкай прамысловасці з'явіліся ў крамах Рэспублікі Тыва, Калмыкіі, на Алтаі. Па выніках мінулага года, экспарт беларускіх тавараў лёгкай прамысловасці ва Уральскую, Сібірскую і Далёкаўсходнюю акругі Расійскай Федэрацыі вырас на 16 % і склаў 19,3 млн долараў. А сёлета павялічыліся пастаўкі ў Рэспубліку Калмыкія — да нядаўняга часу беларускія адзенне, абутак, галантарэя і тканіны туды не «даязджалі». На далёкія рынкі Беларусь выходзіць з прызнанымі брэндамі — «Мілавіца», «Элема», «Белвест», Conte і г. д.

А наогул, тавары прадпрыемстваў «Беллегпрама» пастаўляюцца ў больш чым 50 краін свету, што сведчыць аб наяўнасці стабільнага попыту на беларускі трыкатаж, бялізну, ільняныя вырабы, скураны абутак і г. д. Каля 70 % вырабленай на прадпрыемствах канцэрна прадукцыі экспартуецца. Так, беларускія прадпрыемствы лёгкай прамысловасці павялічылі сваю прысутнасць у Казахстане, Азербайджане, Арменіі, Таджыкістане (новы рынак, які з'явіўся сёлета), а таксама ў Індыі і Турцыі. Пастаўкі ў Кітай выраслі ў чатыры разы. У планах — пастаўкі беларускіх тканін у Афрыку.

— Радуюць станоўчыя зрухі на рынках сярэднеазіяцкіх краін, — адзначыла Таццяна Лугіна. — Часам гучала: што мы можам прапанаваць Таджыкістану, Узбекістану, Казахстану, Арменіі — краінам, якія самі дынамічна развіваюць лёгкую прамысловасць? Але аказалася, што нам ёсць што ім прапанаваць: і нашы ўнікальныя льняныя тканіны, і тканіны з поліэфіру.

Складана пераацаніць ролю дзяржавы ў захаванні не толькі прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці, але і партнёраў легпрама — «Магілёўхімвалакно» і «Светлагорскхімвалакно», падкрэсліла кіраўнік канцэрна.

— За кошт гэтых сыравінных пазіцый мы маем канкурэнтную перавагу, і для часткі нашых асартыментных пазіцый ёсць патэнцыял, напрыклад у сярэднеазіяцкіх рэгіёнах. Там шмат бавоўны, але поліэфірных пазіцый няма. А ў нас ёсць вопыт і кампетэнцыі па вытворчасці, напрыклад тэхнічнага тэкстылю.

Тэхнічны тэкстыль вельмі запатрабаваны на міжнародным рынку, распавяла кіраўнік канцэрна, і ўсе рэгіёны свету актыўна пагльнаюць гэтую таварную пазіцыю, бо з такіх тканін ствараецца, напрыклад,



Фота БелТА.

спецвопратка для вайскоўцаў, ратавальнікаў і іншых службаў. Тканіны з негаручых нітак выкарыстоўваюцца ў машынабудаванні, газавай і нафтавай прамысловасцях.

— Рынкі Украіны, Еўрасаюза, ЗША, Канады былі для нашых прадпрыемстваў высокамаржынальнымі, — распавяла кіраўнік канцэрна «Беллегпрам». — Асабліва рынак Украіны. Калі казаць пра ўзровень рэнтабельнасці, аналізуючы гэты паказчык па ўсіх краінах свету (а мы ў дасанкцыйны перыяд ажыццяўлялі пастаўкі прадукцыі легпрама ў 52 краіны), — самым высокамаржынальным быў рынак Украіны. Значным для нас быў і рынак Еўрасаюза — туды мы пастаўлялі дываны, лён, тэкстыль і г. д. Але заўважу, што і да санкцый парадку 56 % (да 60 % у апошнія гады) прадукцыі беларускага легпрама пастаўлялася на рынак РФ. Таму пераарыентавацца нам было прасцей, чым іншым галінам. Рынак Расіі лаяльны да беларускіх тавараў і адкрыты для беларускай прадукцыі лёгкай прамысловасці. Акрамя таго, шэраг беларускіх прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці працягвае супрацоўніцтва (няхай і ў невялікім аб'ёме) з рынкам Еўрасаюза, з некаторымі краінамі — той жа Сербіяй. Актывізавалі мы і супрацоўніцтва з азіяцкімі краінамі. Тэмпы росту склалі больш за 110 % у Таджыкістане, Казахстане, Узбекістане.

На гэты момант, адзначаюць у канцэрне, пытанне імпартазамяшчэння ў галіне вострa не стаіць. Паступова ўвасабляюцца ў жыццё імпартазамяшчальныя праекты. Напрыклад, Мінскі эксперыментальна-фурнітурны завод рэалізоўвае інвестыцыйны праект у мэтах пашырэння наменклатуры, а з узнікненнем пытання па фарбавальніках для тканін рэалізаваны праект на базе ААТ «Белфа». Многіх пастаўшчыкоў фарбавальнікаў і некаторых хімікатаў для апрацоўкі тканін прыйшлося змяніць. Нядрэнна зарэкамендавалі сябе турэцкая і індыйская хімічная прамысловасць, кітайскія калегі «падставілі плячо» некаторым прадпрыемствам, адзначыла кіраўнік канцэрна. А ў цэлым, сёння легпрам імкнецца максімальна знізіць залежнасць галіны ад знешніх паставак.

## ДЛЯ БЕЛАРУСКАГА ПАКУПНІКА

— Важная задача для нас акрама нарошчвання экспарту — захаванне і павелічэнне прысутнасці нашай прадукцыі на ўнутраным рынку, — падкрэслівае кіраўнік канцэрна «Беллегпрам».

Задаволіць чаканні айчыннага спажыўца — вопытнага, прыдзірлівага, распешчанага традыцыйнай беларускай якасцю і шырокай прапановай — няпроста. Але, як адзначаюць у канцэрне «Беллегпрам», галіна прымае выклік, прыняўшы тэзіс «Беларускія вытворцы здольны апрануць любога спажыўца». Напрамак, разлічаны на «моднікаў», — выпуск капсульных калекцый, у якія ўваходзіць літаральна дзясятак (або менш) прадметаў адзення, аб'яднаных агульнай канцэпцыяй. Гэты падыход мы бачым і ў буйных брэндаў — «Элема», «Калінка», і ў невялікіх кампаній: такім чынам, вы не сустрэнеце іншую дзяўчыну «ў такой жа сукенцы». Яшчэ адзін новы і вельмі запатрабаваны кірунак — прыгожае, якаснае, высокафункцыянальнае адзенне для спорту і турызму. Айчынны брэнд IROS (нядаўна ён адкрыў краму ў ГЦ «Замак») стварае спартыўную вопратку, якая не саступае сусветным аналагам — па дызайне, каларыстыцы, валокнах. Таксама сёлета «Світанак» прэзентаваў спартыўную калекцыю з поліамідных нітак і нанавалокнаў, створаную сумесна з Федэрацыяй лёгкай атлетыкі, — яе тэсціравалі прафесійныя спартсмены.

Разам з тым Брэсцкі панчошны камбінат спачатку адмовіўся, а цяпер зноў выпускае бавоўняныя калготы «для бабуль»: з'явіўся спажывецкі запыт. Аб'ём выпуску гэтых вырабаў зусім невялікі, але запыт вытворца задаволіў. Адначасова кампанія стварае лінейкі шкарпэтак з дзёрзкімі маладзёжнымі прынтамі.

А ў цэлым, будучыня — за рэалізацыяй запатрабаванай і высакаякаснай гатовай прадукцыі: «Беллегпрам» рухаецца ў бок высокамаржынальнага тавару з большай дабаўленай вартасцю.

## ШЫЦЬ ДРУЖНА

Сёння ў краіне больш за 2000 арганізацый лёгкай прамысловасці — ад гігантаў да лакальных дызайнерскіх майстэрань.

— Каля трох гадоў таму намецілася ўсплёск развіцця лёгкай прамысловасці праз прыватны бізнес. З'явілася шмат дызайнерскіх цэхаў і лабараторый, міні-вытворчасцяў па пашыве моднага адзення, абутку, галантарэі, якія пачалі актыўна праяўляць сябе ў развіцці галіны, — распавяла Таццяна Лугіна. — Іх калекцыі рэалізоўваюцца ў запатрабаваных фарматах, такіх як трэнд-паркі, якіх ужо некалькі ў Мінску. Акрамя таго, гэтыя вытворцы актыўна выходзяць на расійскі рынак.

Усяго ў галіне занята звыш 70 тысяч чалавек (з якіх амаль палова — работнікі прадпрыемстваў канцэрна). Выпрацоўваюцца тканіны ўсіх відаў і трыкатажныя палотны, пража і нятканыя матэрыялы, хатні тэкстыль і вырабы спецыяльнага прызначэння, бялізна і панчошна-шкарпэтачныя вырабы, адзенне ўсіх відаў (дзіцячае, маладзёжнае, дзелавы стыль, кэжуал), гарбарная і тэкстыльная галантарэя, абутак, фурнітура і г. д. Таму неабходна кааперацыя ў галіне, фарміраванне вытворчых праграм з улікам магчымасцяў адзін аднаго — як прадукцыі, абсталявання і тэхналогій, так і кампетэнцый, і працоўных рэсурсаў. Гэта дазваляе актывізаваць велізарны патэнцыял галіны. Кааперацыя і аб'яднанне брэндаў лёгкай прамысловасці — адна з ключавых тэндэнцый апошніх гадоў, і пакупнік не можа гэтага не заўважаць. Нароўні з адкрыццём шоўрумаў канкрэтнага вытворцы і аб'ектаў фірмовага гандлю з'яўляюцца гандлёвыя пляцоўкі, дзе прадстаўлены шырокі спектр вытворцаў. Гэта вельмі зручна для наведвальнікаў. Мультыбрэндавыя прасторы адкрываюцца і ў Беларусі, і ў Расіі (прыкладам можа служыць, у прыватнасці, LEGKO ў Арэнбургу: шматфункцыянальная прастора аб'ядноўвае шырокую лінейку беларускіх тавараў — Аршанскага льнокамбіната, «Камволя», «Магатэкса», «Галантэі», «Світанка», «Бабруйсктрыкатажа» і г. д).

Адкрыццём гэтага года можна назваць новы для беларускай лёгкай прамысловасці фармат гандлю — стокі.

— Сёлета першая стокавая крама адкрытая ў Гомелі, — распавяла Таццяна Лугіна. — Каля 10—12 прадпрыемстваў канцэрна прадставілі там прадукцыю мінулых гадоў па невысокіх цэнах. Сток працуе два месяцы. Калі пакупніцкая аўдыторыя ўспрыме такі фармат, мы плануем адкрыццё яшчэ 4-5 падобных гандлёвых пунктаў у рэгіёнах.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# Аснова харчовай бяспекі

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Мы сапраўды ганарымся тым, што ўжо ў 33-і раз арганізоўваем выстаўку «Белагра». Тут мы абагульняем міжнародны вопыт у сферы сельскагаспадарчага машынабудавання. Акрамя таго, дэманструем развіццё навукі ў Беларусі і нашы дасягненні ў харчовай прамысловасці. Падкрэслю, што мы адкрыты для супрацоўніцтва з усімі краінамі, якія ўдзельнічаюць у гэтай выстаўцы», — сказаў Леанід Заяц.

Ён нагадаў, што першая выстаўка «Белагра» праводзілася ў 1990 годзе. «Тады ў нас не было асаблівых падстаў для гонару, а сёння наша краіна набыла зусім іншы статус. Цяпер на нашу выстаўку з'язджаецца паўкантынента. Нягледзячы на санкцыі, да нас прыязджаюць прадстаўнікі краін ЕС. Пры гэтым наша краіна дэманструе выдатныя дасягненні ў аграпрамысловым і нафтахімічным комплексах. Беларуская навука таксама ідзе ў нагу з часам, забяспечваючы нас новымі насеннем і тэхналогіямі», — заявіў віцэ-прэм'ер.

Як адзначылі ў Мінсельгасхарчы, Беларусь мае самазабеспячэнне па малочнай галіне на 263 %, а па мясной — на 134,9 %. Каментуючы гэтыя лічбы, Леанід Заяц дадаў, што па выніках работы за чатыры месяцы 2023 года экспарт беларускай сельскагаспадарчай сыравіны і харчавання склаў 2,7 мільярда долараў.

Віцэ-прэм'ер адзначыў, што Беларусь цалкам забяспечыла сваю харчовую бяспеку і паспяхова прадае лішкі за мяжу. «Рэкордным у плане паставак для нас быў мінулы год. Тады рост экспарту сельскагаспадарчай сыравіны і харчавання склаў 124 %, або 1,6 мільярда долараў. Сёлета па выніках работы за чатыры месяцы мы прыплюсавалі 11,2 % да аналагічнага ўзроўню мінулага года. Гэта сведчыць аб тым, што нашу прадукцыю паважаюць і плацяць за яе немалыя грошы», — падкрэсліў Леанід Заяц.

Паводле яго слоў, такія вынікі сталі магчымыя дзякуючы таму, што 15 гадоў назад у тэхнічнае і тэхналагічнае пераўзбраенне прадпрыемстваў Беларусі былі ўкладзены вялікія сродкі.







«Адзначу, што гэта не мяжа, бо намі яшчэ не да канца вывучаны рынкі Афрыкі. Таксама можна больш актыўна працаваць з Кітаем. Да таго ж мы развіваем супрацоўніцтва з Расіяй, у прыватнасці па імпартазамяшчэнні. Мы захавалі якасць нашай прадукцыі, таму яна карыстаецца вялікім попытам за мяжой», — заявіў намеснік прэм'ер-міністра. Ён таксама дадаў, што кіраўнік дзяржавы ставіць задачу перад галіной сельскай гаспадаркі давесці экспарт да 10 мільярдаў долараў за год.

Асобна спыніўся Леанід Заяц на забеспячэнні ўнутранага рынку ранняй зялёнінай і іншай вітамінавай прадукцыяй. «У папярэднія гады мы закуплялі гэтую прадукцыю ў заходніх краінах. У далейшым гэтага не павінна быць, лічыць віцэ-прэм'ер. «У міжсезонны перыяд 2023/2024 года нашы спажыўцы будуць есці выключна беларускія свежыя агуркі. Прымаюцца ўсе неабходныя меры таксама і па забеспячэнні таматамі, спадзяёмся да 2027/2028 года канчаткова вырашыць гэтую задачу», — падсумаваў Леанід Заяц.

А ў той жа час **міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар БРЫЛА** заявіў, што дадзеная выстаўка — гэта дэманстрацыя ўсіх тэхналагічных магчымасцяў, якія ёсць у Беларусі. «Нам не сорамна паказаць айчынныя тэхналогіі ў вытворчасці трактарнага і машыннага паркаў, а таксама тэхналогіі ў вытворчасці прычапной тэхнікі. Сёння мы выстаўляем высокапрадукцыйных жывёл, праводзім конкурсы, у прыватнасці, выбіраем найлепшую малочную карову краіны. Таксама на выстаўцы прадстаўлены тэхналогіі вытворчасці дайльнага абсталявання і іншыя аспекты, якія ахопліваюць АПК», — сказаў Ігар Брыла.

Ён адзначыў, што «Белагра» добра ведаюць ва ўсім свеце, і кожны год выстаўку наведвае ўсё больш кампаній. «Тут прадстаўлена каля 450 кампаній — для нас гэта вялікі крок, асабліва ў параўнанні з мінулым годам. Прысутнічаюць каля 16 дэлегацый з розных краін. Дастаткова актыўна ўдзельнічае Расійская Федэрацыя, ад якой прадстаўлена 14 стэндаў з розных рэгіёнаў гэтай вялікай дзяржавы. Упэўнены: у нас атрымаецца добры і прадукцыйны дыялог з усімі ўдзельнікамі», — падкрэсліў міністр.



На адкрыцці выстаўкі ў якасці ганаровага госця быў **намеснік міністра сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі Іван ЛЕБЕДЗЕЎ.** Ён адзначыў, што паміж Беларуссю і Расіяй сфарміравана правільная партнёрская палітыка. «Пра гэта гавораць лічбы ўзаемнага гандлю. Так, у 2022 годзе дасягнуты рэкордныя паказчыкі па колькасці прадукцыі, якая пастаўляецца, і грашовым эквіваленце. Мы ўжо фіксуем дынаміку і рост, таму ў цэлым па годзе чакаем добрых паказчыкаў. Так, за першы квартал гэтага года прырост па ўзаемным гандлі паміж Беларуссю і Расіяй у галіне сельскай гаспадаркі склаў 25 % у адносінах да аналагічнага перыяду мінулага года. Мы працуем і глядзім на ўсе напрамкі сумесна. Упэўнены, разам дасягнём яшчэ больш вынікаў», — сказаў Іван Лебедзеў.

Выстаўка арганізавана ў ходзе правядзення Беларускага аграпрамысловага тыдня з 6 да 11 чэрвеня ў выставачным цэнтры індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Гэты аграрны форум знаёміць усіх удзельнікаў з передавымі кірункамі ў развіцці раслінаводства, жывёлагадоўлі, птушкагадоўлі і з сучаснымі тэхналогіямі перапрацоўкі. Аграпрамысловы тыдзень уключае не толькі «Белагра-2023», але і выстаўкі «Белферма», «Белпрадукт» і «Харчовая індустрыя».

Аграрны форум традыцыйна збірае разам не толькі беларускіх аграрыяў і работнікаў харчовай і перапрацоўчай прамысловасці, але і іх замежных калег і партнёраў. Сёлета ўдзел бяруць сотні кампаній з Беларусі, Расіі, Кітая, Пакістана, Турцыі, В'етнама, Германіі, Італіі, Індыі, Палесціны. Таксама выстаўку наведаюць дэлегацыі краін далёкага замежжа, сярод якіх Зімбабвэ, Егіпет, Іран, Кенія, Куба, Манголія, Сірыя, Уганда, ПАР.

Калектыўныя экспазіцыі сфарміравалі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі, Міністэрства прамысловасці, Нацыянальная акадэмія навук, канцэрн «Белдзяржхарчпрам», «Белкаапсаюз», а таксама ўсе вобласці Беларусі.

Штогод «Белагра» становіцца адной з галоўных пляцовак для дзелавых перагавораў. Шырокае кола пытанняў па забеспячэнні канкурэнтаздольнасці сельгаспрадукцыі, выкарыстанні зямельных рэсурсаў з пункту гледжання экалагічнай і эканамічнай эфектыўнасці, перспектывы супрацоўніцтва Беларусі з краінамі блізкага і далёкага замежжа ў сферы вытворчасці інавацыйных тэхналогій у галіне сельскай гаспадаркі, а таксама іншыя актуальныя пытанні можна будзе абмеркаваць у ходзе тэматычных канферэнцый і семінараў.

Міжнародная спецыялізаваная выстаўка адкрыта для свабоднага наведвання з 10.00 да 18.00 да нядзелі ўключна. З Мінска да месца правядзення мерапрыемства арганізаваны бясплатныя транспартныя маршруты ад станцыі метро «Магілёўская».

**Сяргей КУРКАЧ.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Кыргызстане затрымалі больш чым 30 падазроных у падрыхтоўцы дзяржперавароту



Пра гэта паведамілі ў Дзяржкамітэце нацыянальнай бяспекі краіны, перадае інфармагенцтва «Хабар». У ведамстве расказалі, што затрыманыя вялі падпольную падрыхтоўку для таго, каб наладзіць на тэрыторыі краіны масавыя акцыі пратэсту і маштабныя беспарадкі з наступным гвалтоўным захопам улады. Злачынная група на працягу года праводзіла мэтанакіраваную работу па прыцягненні прыхільнікаў і вярбоўцы найбольш незадаволеных грамадзян па ўсёй тэрыторыі краіны. Следствам устаноўлена, што ў групу змоўшчыкаў уваходзіла больш чым 100 чалавек з розных пластоў грамадства і розных рэгіёнаў краіны, паміж якімі былі дакладна размеркаваны ролі з канкрэтнымі заданнямі. 30 з іх затрыманы і ўжо далі прызнальныя паказанні. Паводле інфармацыі дзяржкамітэта, змоўшчыкі планавалі пачаць дзейнічаць адразу пасля ўзнікнення незадаволенасці ў грамадстве па якім-небудзь здарэнні.

### З-за пашкоджання Кахоўскай ГЭС уведзены рэжым надзвычайнай сітуацыі



Мінулай ноччу УСУ нанеслі ўдары па Кахоўскай ГЭС у Херсонскай вобласці, у выніку была пашкоджана верхняя частка гідраэлектрастанцыі. Удары наносіліся, як мяркуецца, снарадамі з рэактыўнай сістэмы залпавага агню «Альха». Па словах кіраўніка адміністрацыі Новакахоўскай гарадской акругі Уладзіміра Лявонцьева, вада хутка паднялася па левым беразе Дняпра да 10 метраў, цалкам пад вадой знаходзіцца Дняпранскі востраў ніжэй па цячэнні, «вада бескантрольна скідаецца праз разбураныя збудаванні». Уладзімір Лявонцьеў дадаў, што ўкраінскія вайскоўцы працягвалі абстрэльваць горад і раён Кахоўскай ГЭС. На тэрыторыі Новакахоўскай гарадской акругі ўведзены мясцовы рэжым надзвычайнай сітуацыі. Гэта зроблена «для правядзення аварыйна-ратавальных і неадкладных работ» па ліквідацыі наступстваў разбурэння Кахоўскай ГЭС.

### Па ўсёй Канадзе бушуюць маштабныя лясныя пажары



Амаль ва ўсіх канадскіх правінцыях і тэрыторыях краіны зафіксаваны лясныя пажары, паведамляе Reuters. Паводле заявы афіцыйных асоб, Канаду чакае няпросты год у сувязі з леснымі пажарамі. Сіноптыкі прагназуюць, што цёплыя і сухія ўмовы захаваюцца ў краіне да канца лета. Размеркаванне агню ад узбярэжжа да ўзбярэжжа сёлета непрадказальнае. Больш за ўсё ад яго на дадзены момант пацярпела правінцыя Квебек. Пажары тут былі справакаваны ўдарам маланкі. Як адзначылі спецыялісты Міністэрства прыродных рэсурсаў Канады, за апошнія 20 гадоў не назіралася, каб такая вялікая плошча выгарала так рана ў пачатку сезона.

Дзейныя асобы

# ПАД АБЯРЭГАМ БУРШТЫНУ

**Добрая навіна: у нас на Маларытчыне з'явіўся... крыж Ефрасінні Полацкай. Дакладней, вядома ж, копія, зробленая рукамі брыгадзіра «Ляхаўцы» ААТ «Макраны» С. К. БУРШТЫНА.**

У раёне Сцяпан Канстанцінавіч *(на здымку)* вядомы тым, што на другім паверсе ўласнага дома стварыў прыватны краязнаўчы музей. Плошча яго каля 60 кв. м. На іх размешчаны больш за дзве тысячы экспанатаў, размеркаваных па чатырох асноўных раздзелах: «Ваенная гісторыя», «Этнаграфія», «Летапіс калгаса», «Гісторыя маёй сям'і». Апроч таго, нядаўна музейшчык завяршыў работу над ілюстраванай гісторыяй аграгарадка Макраны, якую назваў «Ці павінна зямля калгасу?», а цяпер працуе над стварэннем новага раздзела «Бурштынавы цуд». Пачэснае месца ў гэтай экспазіцыі зойме копія крыжа, які быў выраблены ў 1161 годзе майстрам Лазарам Богшам па замове прападобнай ігуменні Ефрасінні Полацкай і страчаны ў час Другой сусветнай вайны.



...Задума стварыць яшчэ адну копію беларускай святыні (першую, у поўны памер, вырабіў брэсцкі ювелір-эмальер Мікалай Кузьміч) у Сцяпана Бурштына ўзнікла даўно, а ўмацавалася пасля паездкі ў Полацк, у Спаса-Ефрасіннеўскі жаночы манастыр.

Аднак з чаго было пачынаць? Сцяпан Канстанцінавіч спадзяваўся на дапамогу Усявышняга, вывучаў кнігі і артыкулы, якія ўдавалася адшукаць у мясцовай бібліятэцы ды інтэрнэце, і паступова прыходзіў да думкі, што аснову копіі крыжа зробіць з драўніны дуба. Яна, па-першае, мае прыгожую афарбоўку і тэкстуру, па-другое, шчыльная і пругкая, добра захоўваецца — нават у зямлі і пад вадой...

А ўпрыгожыць крыж Сцяпан Бурштын вырашыў, вядома ж, бурштынам, калекцыю якога збіраў дзесяцігоддзямі. Жадаючы зрабіць прыемнае, вырабы з гэтага мінералу Сцяпану Канстанцінавічу дарылі ўсе.

— Бурштын — гэта зацвярдзелая смала хвойных дрэў, — гаворыць калекцыянер. — У старажытнасці яе лічылі жывой, раілі ў якасці абярэгаў насіць падарожным і вайскоўцам.

Для аздобы копіі крыжа Сцяпан Бурштын падабраў камяні жоўтага і чырвонага колераў, якія збіраў не адзін год. Да дубовай асновы вырашыў прымацоўваць іх з дапамогай універсальнага клею В-7000. Перад пачаткам работы ўзяў благаславенне ў настаяцеля мясцовага храма іерэя Сергія Капанькі. Да работы прыступіў з малітвай 23 сакавіка.

Копія крыжа мае такія ж памеры, як арыгінал: вышыня 51,8 см, даўжыня верхняй папярочкі — 14 см, ніжняй — 21,2 см, таўшчыня — 2,5 см. Пасярэдзіне крыжа знаходзіцца распяцце, над ім — выява Божай Маці. Па баках ніжняй папярочкі злева — паясная выява Божай Маці з Ісусам Хрыстом на руках, справа — выява Божай Маці, у верхнім канцы крыжа — паясная выява Ісуса Хрыста, які ў руках трымае Біблію. Выявы Божай Маці, Ісуса Хрыста — і на бакавой паверхні копіі.

Для захоўвання твора Сцяпан Канстанцінавіч набыў адмысловы шкляны футляр. Побач з ім размясціў дзве іконы прападобнай Ефрасінні Полацкай. Такім чынам стварылася свайго роду бажніца...

Музей Сцяпана Бурштына, які пачынаўся з таго, што старыя «непатрэбныя» рэчы гаспадар не выкідваў, а заносіў на другі паверх дома, адкрыты для ўсіх. На экскурсіях пабывала нямала школьнікаў, прыязджалі краязнаўцы з Брэста і Пінска, госці з Расіі, Польшчы, Германіі і Украіны.

**Мікалай НАВУМЧЫК,**
**фота аўтара.**

*г. Маларыта*

Зварот у рэдакцыю

# «РАССТУПІЦЕСЯ... ДАЙЦЕ ПАДМЕСЦІ!»

***«Напэўна, кожны пасажыр нашага метрапалітэна бачыў, як прыбіральшчыцы сухім венікам падмятаюць прыступкі і падлогу пераходаў, падымаючы ў паветра пыл, — піша пенсіянер Леанід МЯЛЕШКА. — Гэта робіцца днём і ўвечары, нават сярод натоўпу. Між тым эксперты выявілі, што дробныя часціцы пылу, якія прысутнічаюць у паветры «падземкі», адрозніваюцца па сваім складзе ад пылу ў іншых месцах. Яны больш «багатыя» металамі, асабліва жалезам і меддзю».***

Па меркаванні спецыялістаў, як паведамляе спадар Мялешка (у мінулым, дарэчы, урач прафілактычнай медыцыны Мінскага гарадскога клінічнага цэнтра псіхіятрыі і псіхатэрапіі), пыл метрапалітэна небяспечны для здароўя, паколькі яго таксічныя часцінкі здольныя пранікаць у арганізм, пашкоджваць не толькі дыхальныя шляхі, але і лёгкія, печань, ныркі, мозг. Вялікая колькасць пылу, якая доўга носіцца ў паветры і не асядае, можа стаць прычынай астматычных і алергічных захворванняў. Думаю, гэтых довадаў дастаткова для таго, каб не разганяць пыл сухім венікам, каб ліквідаваць гэты «рэлікт» з нашага цудоўнага метро.

Для прыборкі чытач прапануе выкарыстоўваць малагабарытныя аўтамабільныя, ранцавыя пыласосы з аўтаномным сілкаваннем.

**Па каментарый да звароту мы звярнуліся ў ДП «Мінскі метрапалітэн».** Як паведамляецца ў афіцыйным адказе за подпісам **намесніка дырэктара па эксплуатацыі Вадзіма ПАЛІШЧУКА**, санітарна-гігіенічныя патрабаванні да ўтрымання ўсяго комплексу станцыйных збудаванняў метрапалітэна вызначаны санітарнымі нормамі, правіламі і гігіенічнымі нарматывамі «Гігіенічныя патрабаванні да ўмоў працы работнікаў і эксплуатацыі метрапалітэнаў», зацверджанымі пастановай Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 19.10.2010 № 135. «У адпаведнасці з патрабаваннямі санітарных нормаў для кожнай станцыі метрапалітэна распрацаваны тэхналагічны працэс работы станцыі, у якім устаноўлены парадак, перыядычнасць і спосабы яе прыбірання. У прыватнасці, у начны час ажыццяўляецца асноўнае прыбіранне, у тым ліку вільготнае, пасажырскіх зон (платформы, вестыбюлі, тэрыторыі, прылеглыя да ўваходаў на станцыі, пешаходныя пераходы, маршавыя лесвіцы і калідоры), а ў дзённы час — падтрымлівальнае прыбіранне. У сувязі з магчымасць правядзення сухога прыбірання з дапамогай пераносных пыласосаў. Вывучаліся характарыстыкі акумулятарных, таму што пры наяўнасці руху грамадзян небяспечна працаваць пыласосам ад электрычнай сеткі. Асноўны мінус пераноснага акумулятарнага пыласоса — непрацяглы час работы акумулятара. Для яго падзарадкі патрабуецца пэўны час, а ў выпадку неабходнасці правядзення тэрміновага прыбірання скарыстацца пыласосам будзе немагчыма.

Варта адзначыць, што для правядзення прыбірання тэрыторыі станцый не-



гэтым дзяжурным персаналам днём з пэўнай перыядычнасцю ажыццяўляецца абход станцыі з мэтай выяўлення недахопаў і падтрымання неабходнага санітарнага стану.

У дзённы час вільготнае прыбіранне маршавых лесвіц, а таксама падземных пешаходных пераходаў немагчыма з прычыны пастаяннага патоку пасажыраў метрапалітэна або іншых грамадзян (людзі могуць паслізнуцца на вільготнай падлозе і атрымаць траўму), таму выконваецца толькі сухое прыбіранне з дапамогай веніка. Сухое прыбіранне маршавых лесвіц ажыццяўляецца падчас мінімальнага пасажырапатоку на станцыях метрапалітэна. Аднак на перасадачных станцыях «Купалаўская» і «Кастрычніцкая» прыбіранне абцяжарана з прычыны значнага пасажырапатоку.

У Мінскім метрапалітэне была таксама разгледжана абходна выкарыстоўваць пыласосы з высокай магутнасцю ўсмоктвання. Дадзеныя мадэлі досыць шумныя і маюць значныя габарыты. А інструкцыяй па эксплуатацыі рэкамендавана выконваць асаблівую асцярожнасць, працуючы на лесвіцы, каб выключыць траўміраванне пасажыраў або іншых грамадзян, а таксама саміх прыбіральшчыц, сярод якіх, у тым ліку, і пажылыя жанчыны. Габарыты вышэйназванага абсталявання могуць выклікаць цяжкасць у перамяшчэнні людзей, а шум ад пыласоса — скажонасць і недакладнасць атрымання інфармацыйнага тэксту пасажырамі ад работнікаў метрапалітэна. Таму ў цяперашні час падтрымліваць санітарны стан пасажырскіх зон у дзённы час іншым спосабам не ўяўляецца магчымым».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

На чужых памылках

# «ЛЮДЗІ РАНЕЙ БЫЛІ РАЗУМНЕЙШЫЯ:

## ЖАНІЛІСЯ І ЖЫЛІ...»

**Дрэнны ў мяне характар: калі бачу, што на дарозе нехта галасуе, прасіць падвезці, абавязкова спынюся, падбяру. А потым, здаралася, падчаплю нейкі вірус, перахварэю ці буду перажываць за чужога, зусім не знаёмага мне чалавека, які па дарозе раптам адкрые сваю душу.**

Тацццяна вось расказала, што вырасла ў вёсцы, у вельмі дружнай, працавітай сям'і, добра скончыла школу, пайшла працаваць, зарабляць свае першыя грошы і вопыт, шукаць кахання і шчасця.

З першым ёй, здаецца, пашчасціла, бо кахала сама і была каханай, выйшла замуж, нарадзіла дачушку, а вось шчасця пры гэтым амаль не мела, бо муж, мякка кажучы, выпіваў, і тады месца ў хаце не было нікому. Жонка з дзіцем начавала то ў сваім гумне, то ў чужым, сыходзіла да бацькоў і, паверыўшы чарговым абяцанням, вярталася, зноў уцякала, падавала на развод. І ён такі ўрэшце адбыўся. Тацццяна з дачкой пераехала ў іншы горад, знайшла новую работу, а з гадамі — і новага надзейнага спадарожніка жыцця. Ягор быў непітушчы, старэйшы за яе, рана аўдавеў, дарослыя дзеці жылі асобна, ён — адзін... Прапанаваў пераехаць і жыць разам. Дом, маўляў, вялікі...

Упершыню ўбачыўшы яго, Таццяна зразумела, што не было там не толькі гаспадыні, але і гаспадара: дах працякаў, вокны гнілыя, сцены ды столь дваццаць гадоў нефарбаваныя...

А таму, згадзіўшыся на пераезд, жанчына замкнула сваю невялічкую кватэру і, што называецца, закасала рукавы: узялася за капітальны рамонт, за 20 «сотак» задзіранелай зямлі, за гаспадарку. У хуткім часе на закінутым раней падворку з'явіліся куры і гусі, потым трусы і козы. На вялікім прысядзібным участку чаго толькі не цвіло і не расло. Ягор стаў жыць як у бога за плячыма. Трэба нешта зрабіць? «Танечка, давай ты, бо ты ж маладзейшая», «... Ты спрытнейшая», «... Цябе хутчэй паслухаюць». І Таццяна ішла — усюды. Адзінае...

На пачатку сумеснага жыцця Ягор не раз заводзіў размову аб тым, што трэба схадзіць у ЗАГС, узаконіць адносіны. А яна ўсё адкладвала: то няёмка было перад дарослай дачкой, то часу бракавала, ды і шлюб, казала, гэта не штамп у пашпарце. Яшчэ паспеюць, маўляў...

Яна меркавала, а Бог размяркоўваў: не паспелі... Хоць у тыя трагічныя хвіліны ўсё зрабіла правільна. Ды і хуткая прыехала амаль адразу...

Таццяна цяжка перажывала страту! А яшчэ цяжэй — тое, што пачалося потым, калі мужавы дзеці сказалі, што яна ў гэтым доме ніхто, што ёй нічога не належыць...

— Дык трэба ж у суд! — казала я сваёй выпадковай спадарожніцы.

— Я хацела і нават збіралася, — уздыхнула жанчына, — а потым... Ведаеце, у мяне характар не той: мне чым сведак збіраць ды нешта даказваць, прасцей яшчэ раз пачаць спачатку. Ну сапраўды — кватэра ёсць, работа ёсць. Зяць з дачкой, калі што, дапамогуць...

— Дай бог! — пажадала я грамадзянскай удаве. А потым доўга думала, што раней людзі былі разумнейшыя: жаніліся і жылі.

Цяпер і ўсё часцей спачатку жывуць (гадамі, а то і дзесяцігоддзямі), а потым застаюцца ні з чым, як тая казачная баба — каля свайго разбітага карыта. Ці не пра такіх Канстанцыя Буйло пісала:

*Маладосць!*
*Ты маеш дзён багата,*
*Ты іх, бесклапотная,*
*не лічыш.*
*Толькі старасць разумее*
*страту:*
*Мала — ды ні ў кога*
*не пазычыш.*

**Т. Міклашэвіч,**
*Мінскі раён.*

Усмешачку!

# ХТО ТАКІ АБІБОК?

**Месяцы два таму, напрадвесні, можна сказаць, да нас у двор забег сімпатычны сусед і пахваліўся, што яго тата павесіў *шкварчэўню*. Гэта — як ён сказаў — спецыяльны дамок для «шпакоў і скварцоў». Новае і, згадзіцеся, цікавае слова. Я назбірала іншых:**

Пратэктар — той, хто робіць пратэкцыю.
Вілачнік — гаспадар вілы.
Акуліст — паляўнічы на акул.
Карпункт — месца кары.
Прырода — акушэрка, бабка-павітуха.
Абібок — баксёр.
Гадзіннік — змеялоў.
Засек — кат з сякерай.
Падкоўдранік — аматар паспаць.
Нябожчык — атэіст.
Кнігавыдавец — бібліятэкар.

**С. Вароніна,**
*Быхаўскі раён.*

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

7 чэрвеня 2023 г. № 19 (705)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


Наталля КАЧАНАВА:

# «НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ МОГУЦЬ ПАТРАБАВАЦЬ ЗМЕН У ЗАКАНАДАЎСТВЕ»

## Менавіта такі значны вынік могуць мець асабістыя прыёмы грамадзян









Фота БелТА.

**НА мінулым тыдні Старшыня Савета Рэспублікі правяла выязны асабісты прыём грамадзян у Паставах Віцебскай вобласці. Адкрыты дыялог з уладай доўжыўся восем гадзін, на Віцебшчыну прыехалі людзі з усіх абласцей краіны. Карэспандэнт «МС» прысутнічала на прыёме і запісала самыя цікавыя моманты.**

Першай са сваёй праблемай, якая цягнецца не адзін год, да Наталлі Іванаўны звярнулася жанчына з Гомельскага раёна. Пенсіянерку ў садовым таварыстве, дзе ў яе знаходзіцца дача, з 2016 года пераследуюць нядобразычлівыя суседзі. Па словах заяўніцы, справа не адзін раз даходзіла да бойкі, спрабавалі рабіць замах і на яе жыццё. У 2018 годзе яе дачу, дзе спаў маленькі ўнук, падпалілі. Саветам таварыства з дадзенай праблемай разабрацца не могуць. Наталля Качанава даручыла органам ахоўы правапарадку і мясцовым органам улады звярнуць на гэту сітуацыю пільную ўвагу.

Сям'я з Гродзенскай вобласці ў снежні мінулага года страціла 66-гадовую маці па прычыне памылкі ўрачоў. Жанчына паступіла ў Ваўкавыскую ЦРБ з моцным болем у жываце і тэмпературай. Абследаванне паставіла дыягназ — камяні ў жоўцяку, на працягу 10 дзён урачы лячылі пацыентку адпаведнымі прэпаратамі, не зважаючы ўвагу на тое, што боль не праходзіў, а тэмпература трымалася. Лячылі ад камянёў, але не заўважылі, што разам з гэтым развівалася складаная форма апендыцыту. Калі пачалі праводзіць больш дэталёвае даследаванне, было занадта позна — жанчына памерла ад перытаніту. Сям'я настойвае на вывучэнні правільнасці дзеянняў медыкаў. Старшыня Савета Рэспублікі даручыла адказным органам разабрацца ў гэтым выпадку і ўзяла пытанне на асабісты кантроль.

Тэму аховы здароўя працягнуў і малады ўрач-гігіеніст з Дзяржынска: ён узняў на прыёме два пытанні. Першае датычылася дыспансерызацыі насельніцтва, а канкрэтна — як аптымальна ахапіць ёй усе катэгорыі насельніцтва. «Цяпер на медыцынскі агляд на працоўным месцы выдзяляюць адзін вольны дзень, аптымальна сумясціць яго і з дыспансерызацыяй. Гэта дазволіць своечасова дыягнаставаць захворванні», — агучыў ідэю малады чалавек. «Гэта прапанова лагічная і рацыянальная. Аднак пытанне ў іншым: ці хопіць у нашай сістэмы аховы здароўя рэсурсаў на ўсіх узроўнях (пачынаючы ад раённых і да абласных устаноў), каб грамадзянін за адзін дзень мог наведаць усіх спецыялістаў? І не менш важна, каб агляд быў не дзеля «птушачкі» ў даведцы, а на якасным прафесійным узроўні, каб чалавек сапраўды быў запэўнены, што яго здароўе ў выдатным стане», — звярнула ўвагу Наталля Іванаўна.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## Дзеці, моладзь, дэпутаты

### На чым была сканцэнтравана ўвага сенатараў на мінулым тыдні

● Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына Старавойтава ўзяла ўдзел у дыялогавай пляцоўцы «Дзеці. Сям'я. Будучыня нацыі», прысвечанай Міжнароднаму дню абароны дзяцей. Мерапрыемства адбылося ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, дзе навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, выхаванцы прыёмных сем'яў і дзіцячых дамоў мелі магчымасць задаць пытанні парламентарыям і прадстаўнікам рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання. Падчас дыялогу сенатар адзначыла, што ў Беларусі ўдзяляецца прыярытэтная ўвага пытанням абароны дзяцінства, сфарміравана сістэма дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, прымаюцца і пастаянна ўдасканальваюцца ўмовы для развіцця інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу дзяцей і моладзі, а таксама меры па рэалізацыі права кожнага дзіцяці на жыццё і выхаванне ў сям'і. Ірына Старавойтава паведаміла, што сур'ёзная ўвага ў рамках работы Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці ўдзяляецца пытанням захавання здароўя і жыцця дзяцей, абароны іх правоў і законных інтарэсаў, удасканалення сацыяльнай палітыкі і механізмаў падтрымкі дзяцінства, умацавання сям'і. У канцы сустрэчы старшыня камісіі падкрэсліла важнасць свядомага і адказнага стаўлення да краіны і грамадства, фарміравання цвёрдай жыццёвай пазіцыі і патрыятызму, захавання гістарычнай памяці, рэалізацыі творчых ініцыятыў моладзі на карысць краіны.

● Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Дзмітрый Баскаў запрасіў дзяцей з Данбаса наведаць адну з самых сучасных арэн беларускай сталіцы — «Алімпік-Арэну». Парламентарый працягвае добрую традыцыю знаёмства юных гасцей Беларусі са спартыўнай інфраструктурай краіны. Каля двух дзясяткаў юных гасцей ва ўзросце ад 9 да 15 гадоў ацаніла якасць лёду, на якім праводзіць свае матчы і каманда Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а потым атрымала магчымасць пагутарыць з яе галоўным трэнерам. Дзмітрый Баскаў абмеркаваў з дзецьмі апошнія спартыўныя навіны, а таксама запрасіў іх на хакейны матч. У завяршэнне сустрэчы юныя жыхары Данбаса атрымалі памятныя падарункі.

● Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец узяла ўдзел у 45-й сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў. Парадак дня пасяджэння ўключаў дзесяць пытанняў. У прыватнасці, абмяркоўвалася ўнясенне змяненняў у рашэнні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў аб бюджэце горада на 2023 год, зацвярджэнне інвестыцыйнай праграмы сталіцы на бягучы год, парадак кіравання і распараджэння гарадской уласнасцю. Увага дэпутатаў была скіравана і на ход выканання мерапрыемстваў па праблемных пытаннях, у тым ліку выказаных грамадзянамі кандыдатам у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў 28-га склікання ў ходзе перадвыбарнай кампаніі. Пераглядзелі падыходы да прысуджэння грашовых прэмій найлепшым навучэнцам сталіцы — іх памер і колькасць павялічаны ў два разы. Прынята рашэнне падчас правядзення акцыі «Дзень без аўтамабіля», што традыцыйна праходзіць 22 верасня, даць пасажырам, якія прад'явілі вадзіцельскае пасведчанне і пасведчанне аб рэгістрацыі транспартнага сродку, права на бясплатны праезд у гарадскім транспарце.

● Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Гродзенскага аб'яднання прафсаюзаў Віктар Ліскові у рамках маладзёжнага злёту прафсаюзнага актыву Гродзенскай вобласці ўзяў удзел у адкрытым дыялогу, прысвечаным тэме малой радзімы. У фармаце сустрэчы без гальштукаў з маладзёжным актывам пагутарылі кіраўнікі дзяржаўных органаў і аб'яднанняў рэгіёна. Як адзначыў Віктар Лісковіч, ужо ў першы дзень злёту хлопцы і дзяўчаты настолькі згуртаваліся, што ўзнікла адчуванне, быццам яны заўсёды былі знаёмыя. «З асаблівым энтузіязмам моладзь уключылася ў работу нашай дыялогавай пляцоўкі, на якой мы гаварылі аб значнасці малой радзімы ў жыцці кожнага чалавека», — удакладніў сенатар.

**Вераніка КАНЮТА.**

# «НЕКАТОРЫЯ ПРАБЛЕМЫ МОГУЦЬ ПАТРАБАВАЦЬ ЗМЕН У ЗАКАНАДАЎСТВЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Урач таксама выказаў думку, што медыкам сёння неабходна ўмець карыстацца сучаснымі тэхналогіямі. Магчыма, у вышэйшых навучальных установах трэба ўводзіць дадатковыя дысцыпліны. А з мэтай інфармацыйнага забеспячэння сістэмы аховы здароўя над распрацоўкай прадукту павінны працаваць не толькі спецыялісты Міністэрства аховы здароўя, але і найлепшыя прадстаўнікі IT-сферы нашай краіны. «Гэта пытанне таксама вельмі важнае для нашых грамадзян, над ім ужо працуюць — Міністэрству аховы здароўя і Парку высокіх тэхналогій дадзена даручэнне», — зазначыла спікер верхняй палаты парламента. Яна падзякавала маладому чалавеку за клопат не толькі пра сябе, але і пра ўсю сістэму аховы здароўя дзеля нашага насельніцтва.

Мужчына папрасіў дапамогі ў рамонце паловы дома, дзе за доўгія гады столь і драўляныя вокны прыйшлі ў нездавальняльны стан. Па словах заяўніка, пасля звароту ў суд мясцовыя органы ЖКГ сталі выконваць магчымыя бягучыя рамонтныя работы, аднак яны не выпраўляюць сітуацыю. Прадстаўнікі ўпраўлення ЖКГ Мінскага аблвыканкама падкрэслілі, што ў наступным годзе будзе праводзіцца абследаванне на неабходнасць капітальнага рамонту. «Калі будынак сапраўды ў крытычным стане, правядзіце экспертызу ў найбліжэйшы час і накіроўвайце сілы і сродкі адразу на капітальны рамонт. Гэта рацыянальны і гаспадарскі падыход», — дала распараджэнне Наталля Іванаўна.

Мінчанін звярнуўся з праблемай нявыплаты зарплаты ў адной з будаўнічых кампаній. З красавіка мінулага года маладому чалавеку не выплацілі каля 26 тысяч рублёў, у падобнай сітуацыі аказаліся і больш за 100 іншых работнікаў фірмы. Нават судовыя звароты не вырашылі сітуацыю. Падчас дыялогу высветлілася, што і дом, у якім мінчанін купіў кватэру, павінен быў быць зданы ў эксплуатацыю ў снежні 2022-га. Палова сумы за запаветныя метры была выплачана, а вось на месцы, дзе ўжо павінен быў стаяць шматпавярховік, і дагэтуль — катлаван. Пытанне ўзялі на кантроль, раздадзены адпаведныя даручэнні адказным асобам. Спікер асабліва падкрэсліла важнасць вырашэння падобных праблем, якім не павінна быць месца ў грамадстве: «Зарплату неабходна выплаціць, чаго б гэта ні каштавала».

Шматдзетны бацька з Мінска, які выхоўвае пяць дзяцей, папрасіў дапамогі ў выкарыстанні мацярынскага капіталу датэрмінова з мэтай паляпшэння жыллёвых умоў. Па законе 82 квадратных метраў кватэры цяпер хапае на сямярых чалавек, аднак па факце будучым школьнікам няма дзе паставіць пісьмовыя сталы. Выключэнняў у заканадаўстве на такія выпадкі няма. Наталля Іванаўна выслухала мужчыну і паабяцала вывучыць гэта пытанне, каб дапамагчы.



Адразу траіх старшынь мінскіх таварыстваў уласнікаў хвалявалі змены ў Жыллёвым кодэксе, над праектам якога актыўна працуюць парламентарыі. З некаторымі пытаннямі яны згадзіліся, з іншымі — не. Напрыклад, прапанову «аднаму старшыні — адзін дом абслугоўвання» яны лічаць некарэктнай, бо цяпер, на думку заяўнікаў, яны і іх калегі выдатна спраўляюцца з некалькімі дамамі адначасова. Між тым яны падзякавалі Наталлі Качанавай за садзейнічанне ў праблеме ўсталявання шлагбаумаў, з якой звярталіся да Старшыні верхняй палаты парламента падчас мінулых прыёмаў грамадзян.

Жыхарка Віцебска жыла з мужам і двума дзецьмі ў двухпакаёвай кватэры. Пасля разводу мужчына адсудзіў больш з двух пакояў, пакінуўшы жонку і дзяцей на малых метрах. У кватэры ён цяпер не пражывае, пакой мае намер прадаць. Заяўніца падала сустрэчны іск, прэтэндуючы на вялікі пакой з умовай таго, што агульны крэдыт і паслугі ЖКГ яна плаціць адна. Адказу пакуль няма. З падобнай праблемай звярнулася і шматдзетная маці з Пастаў: пасля разводу муж займае частку іх агульнага жылля, яна вымушана жыць у бацькоў. Па яе словах, у судзе не ўлічваліся інтарэсы дзяцей і з кім яны застаюцца, а яшчэ жанчыну абавязалі выплаціць мужу значную грашовую кампенсацыю. Старшыня Савета Рэспублікі даручыла органам сацабароны разабрацца ў гэтай справе і ўрэгуляваць жыллёвае пытанне з улікам інтарэсаў дзяцей. «Гэта не першы зварот, такіх выпадкаў даволі многа. Некаторыя праблемы могуць патрабаваць змен у заканадаўстве. Неабходна пры раздзеле маёмасці ўлічваць, з кім застаюцца дзеці», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Таксама на прыёме ўзнімаліся пытанні электразабеспячэння для ацяплення дамоў і рамонту электрасетак, якія не вытрымліваюць узрослай запатрабаванасці ў жыльцоў, паляпшэння жыллёвых умоў у рэгіёне і іншыя праблемы. Па ўсіх зваротах Наталля Іванаўна дала адпаведныя даручэнні і ўзяла пытанні на свой кантроль.

**Аляксандра Гвоздзева.**
**Фота БелТА.**

ЯК ДБАЕШ — ПАВАГУ МАЕШ

# ГРАМАДСКІМ АКТЫВІСТАМ ГАРАДОЎ І ВЁСАК

**Семінар старшынь раённых і сельскіх Саветаў Брэстчыны прайшоў у Целяханах. У ім узялі ўдзел прадстаўнікі Івацэвіцкага, Бярозаўскага, Баранавіцкага, Ганцавіцкага, Ляхавіцкага раёнаў. Раней такія семінары прайшлі ў Іванаве і Каменцы. У цэнтры ўвагі былі пытанні жыццезабеспячэння насельніцтва, павышэння якасці жыцця, прафілактыкі правапарушэнняў, навядзення парадку на тэрыторыях.**

Першае пытанне разгледзелі на прыкладзе Івацэвіцкага раёна. Летась тут прайшлі абласныя «Дажынкі». У абнаўленне пасёлка Целяханы былі ўкладзены сродкі з бюджэту, прыведзены ў парадак шэраг сацыяльных аб'ектаў, але ж многае зроблена з дапамогай мясцовага самакіравання, з актыўным удзелам грамады. Людзі прыводзілі ў парадак уласныя падворкі, тэрыторыю за агароджай, выходзілі на сумесныя працоўныя акцыі. Пра гэта расказаў прысутным **старшыня Івацэвіцкага райсавета дэпутатаў Аляксандр САРОКА.**

У Цэнтры культуры і адпачынку гарадскога пасёлка Целяханы адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў конкурсу сярод сельскіх, гарадскіх Саветаў дэпутатаў, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання вобласці па вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва.




Сярод сельскіх Саветаў найлепшымі сталі: Маўчадскі сельскі Савет Баранавіцкага раёна — першае месца; Люсінскі Ганцавіцкага і Ружанскі Пружанскага раёнаў — другое месца; Бярозаўскі Бярозаўскага і Вялікамалешаўскі Столінскага раёнаў — трэцяе месца.

У ліку калегіяльных органаў грамадскага самакіравання адзначаны: першым месцам — камітэт тэрытарыяльнага самакіравання пры ЖЭС № 2 Пінска, другім — дамавыя камітэты дамоў № 38 па вуліцы 700-годдзя Кобрына (Кобрын) і № 12 па вуліцы Леніна (Высокае Камянецкага раёна), трэцім — дамавы камітэт дома № 163 па вуліцы Даменікана (Баранавічы) і ЖСК № 54 па вуліцы Дуброўская, 19 (Брэст).

Ужо некалькі гадоў у названым конкурсе вызначаюцца пераможцы з ліку старастаў вёсак. На гэты раз першае месца ў Любові Гутнік, старасты вёскі Клепачы Мокраўскага сельсавета Пружанскага раёна. Другое месца занялі Надзея Капуза з вёскі Пескі Клейнікаўскага сельсавета Брэсцкага раёна і Таццяна Брыштэн, староста вёскі Павіцце Кобрынскага раёна. На трэцім месцы — Галіна Сянюта з вёскі Вартыцк Іванаўскага раёна, Мікалай Ляўчук з вёскі Брадзяцін Гвозніцкага сельсавета Маларыцкага раёна. Усе пераможцы ўзнагароджаны дыпломамі і грашовымі прэміямі.

— Сёння немагчыма вырашаць пытанні навядзення парадку без шырокага прыцягнення грамадзян, — сказаў пры ўручэнні ўзнагарод **старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Юрый НАРКЕВІЧ.** — Мы бачым гэтыя прыклады — незвычайнасці, актыўнасці, руплівасці на месцах. І мы рады падзякаваць публічна гэтым людзям, асабліва старастам, паставіць іх у прыклад іншым.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з тэлеграм-канала Івацэвіцкага райвыканкама.**

# КАЛІ ПРАФЕСІЯ — ФУНДАМЕНТ БУДУЧЫНІ

## У Гродне дэпутаты разгледзелі праблему падрыхтоўкі кадраў

**Падчас пасяджэння прэзідыума абласнога Савета размова ішла аб кірунках работы сістэмы прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі па забеспячэнні галін эканомікі кваліфікаванымі спецыялістамі. Быў зроблены акцэнт на тым, якія меры прымаюцца органамі дзяржаўнага кіравання і самакіравання па выдзяленні першага працоўнага месца і што залежыць ад дэпутацкага корпуса ў вырашэнні гэтых праблем.**

### Стратэгія на якасць навучання

Па словах **старшыні Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алены ПАСЮТЫ**, дзяржава робіць многае для падрыхтоўкі спецыялістаў, але кадравы голад існуе. У асноўным з-за недахопу спецыялістаў рабочых прафесій. У той жа час многія выпускнікі ВНУ з юрыдычнай і эканамічнай спецыяльнасцямі аказваюцца незапатрабаванымі на рынку працы. Маладым людзям важна ўсвядоміць, што няма асаблівай патрэбы ў тым, каб атрымаць вышэйшую адукацыю і потым шукаць сабе працу. А многія яшчэ і не працуюць па спецыяльнасці. А вось рабочая прафесія — надзейны фундамент для будучыні. У гэтым плане больш шанцаў маюць якраз спецыялісты, якія атрымалі рабочыя прафесіі. Яны, як правіла, заўсёды запатрабаваныя. Вось толькі прэстыж рабочых прафесій не на высокім узроўні. Па-ранейшаму захоўваецца трэнд на вышэйшую адукацыю, у той час як атрыманне рабочых прафесій адышло на другі план. І гэты перакос якраз і варта мяняць у сучасных эканамічных умовах.

— Для паскоранага развіцця краіны неабходны кадры, у значнай ступені рабочых прафесій, спецыялісты для прамысловасці і сельскай гаспадаркі, — падкрэсліла Алена Пасюта. — Задача нумар адзін у дэпутатаў — гэта паглядзець, як узаемадзейнічаюць заказчыкі кадраў і тыя выканаўцы, якія іх рыхтуюць. Сёння прадпрыемствы хочуць атрымаць падрыхтаванага спецыяліста. Таму выпускнікі сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных устаноў павінны быць гатовы да першага працоўнага месца, а пры атрыманні вышэйшай ступені адукацыі маглі разумець усе працэсы і прымаць правільныя рашэнні пры кіраванні імі. У сваю чаргу, заканадаўцы павінны звярнуць увагу на тое, якім чынам актывізаваць працэсы якаснага навучання і развіцць гэта паўсюдна па краіне.

Перад каледжамі стаіць задача не проста падрыхтаваць работніка, а выпусціць кваліфікаванага спецыяліста высокага прафесійнага ўзроўню. На гэта скіраваны і самі ўстановы адукацыі. А тыя, што працуюць неэфектыўна, будуць закрывацца, папярэдзіла Алена Пасюта. Такое рашэнне будзе прымацца на сесіі аблсавета.

Старшыня абласнога Савета дэпутатаў таксама звярнула ўвагу на неабходнасць узаемадзеяння навучальных устаноў з прадпрыемствамі. Пакуль у гэтым плане больш актыўна вядзе работу прыватны бізнес, дзе ёсць пэўныя прэферэнцыі для маладых спецыялістаў і адбор маладых кадраў вядзецца даволі дасканала. А вось дзяржаўныя структуры ў гэтым плане адстаюць, зазначыла кіраўнік дэпутацкага корпуса рэгіёна.

— Кадры трэба купляць, — справядліва лічыць Алена Пасюта. — Не толькі зарплатай, але і ўмовамі працы і быту, магчымасцю росту маладых спецыялістаў. У сваю чаргу, і спецыялісты павінны адпавядаць тым запытам, якія патрабуе работадаўца.

Інавацыі — адзін з «кітоў» сучаснай падрыхтоўкі кадраў. Адны толькі лекцыі і падручнікі — гэта пазаўчарашні дзень. Сёння на першы план выходзіць інавацыйны падыход, у прыватнасці стварэнне цэнтраў кампетэнцый, дзе навучэнцы адпрацоўваюць свае тэарэтычныя веды на тых вузлах і агрэгатах, якія ёсць у прамысловасці і сельскай гаспадарцы. У сувязі з гэтым дэпутаты бачаць сваю задачу ў тым, каб выходзіць на ведамствы і профільныя міністэрствы з прапановай больш шырока прадстаўляць навучэнцам тыя навінкі, якія з'яўляюцца на вытворчасці.





### У топе — рабочыя спецыяльнасці

Што такое прэстыж прафесіі, добра ведаюць у Гродзенскім дзяржаўным электратэхнічным каледжы. Тут прадстаўнікі дэпутацкага корпуса азнаёміліся з навучальнай базай установы адукацыі. Штогод адсюль выходзіць каля 250 спецыялістаў электратэхнічнага і аўтамеханічнага профіляў, усе размяркоўваюцца на прадпрыемствы краіны згодна з заяўкамі. Расце попыт на выпускнікоў каледжа ў будаўнічых арганізацыях.

Каледж мае вялікі вопыт падрыхтоўкі кадраў, яго гісторыя пачынаецца з 1939 года. Гэта адна з самых буйных і папулярных навучальных сярэдніх спецыяльных прафесійных устаноў рэгіёна. Былыя традыцыі падмацоўваюцца новымі тэхналогіямі. Для падрыхтоўкі выкарыстоўваецца даволі багатая база: 17 майстэрань, свой аўтадром, аўташкола, шынамантаж, станцыя электраабслугоўвання, вучэбны палігон, сваё праграмнае забеспячэнне для дыягностыкі аўтамабіля. Усё гэта дазваляе наблізіць падрыхтоўку да рэальных умоў працы.

Дэпутатам прадставілі абсталяванне, якім тут карыстаюцца ў навучальным працэсе. Выклікаў цікавасць рэальны стэнд па вывучэнні асвятлення з рознымі рэжымамі ў розныя гадзіны сутак. Некаторыя праграмы з усімі вытворчымі лініямі рыхтуюцца нават для прадпрыемстваў. Па словах выкладчыка Ігара Сталярова, адна з апошніх распрацовак — лінія аўтаматычнага ўключэння рэзерву. Яна запрацуе, калі нейкая частка электрычнай сеткі раптам спынілася. Рэзервовая лінія запраграмавана ў электронным блоку на самых апошніх элементах. Прычым усё абсталяванне — гэта творчасць саміх вучняў і педагогаў.

Для асваення альтэрнатыўнай энергетыкі створана панэль сонечных батарэй, якая таксама рэальна працуе. Гэтая распрацоўка высока ацэнена нават на ўзроўні краіны. Макет ветраўстаноўкі створаны па аналогіі з дзеючымі ветракамі.

Аўтаслесары і механікі трэніруюцца на сапраўдных аўтамабілях, якія стаяць у майстэрні і гаражы. Некалькі гадоў таму ў каледжы ўвялі новую спецыяльнасць — «тэхнік-электронік», якая адразу стала вельмі папулярнай. Як расказаў майстар вытворчага навучання Данііл Крыніцкі, летась конкурс на гэту спецыяльнасць пачынаўся з 8 балаў. Праблемы з працаўладкаваннем няма. У каледжы праходзяць конкурсы з удзелам незалежных экспертаў з СТА. Некаторыя прадстаўнікі станцый тэхабслугоўвання прапаноўваюць навучэнцам практыку, а таксама працоўныя месцы. Праўда, паколькі спецыяльнасць новая, у рэестры многіх прадпрыемстваў пакуль няма такой пасады, патлумачыў Данііл. Гэта значыць, што навучальны працэс працуе на апярэджанне попыту.

Іван Каратаеў з Наваградка і Марк Казіміровіч з Гродна — будучыя аўтаслесары. Выбар зрабілі з-за таго, што любяць займацца аўтамабілямі. Іван рамантаваў і машыну бацькоў. Атрыманых ведаў, кажуць хлопцы, хапае нават з лішкам дзякуючы вытворчай базе. Можна адразу ісці працаваць пасля трох гадоў навучання альбо пайсці на вышэйшую ступень вучобы.

Як запэўніў **дырэктар каледжа электратэхнікі Алег РАХУНОК**, праблем з наборам няма. Каледж — адна з тых навучальных устаноў, дзе працуе цэнтр кампетэнцыі, ці, як іх раней называлі, рэсурсны цэнтр. Тут маюць магчымасць прайсці навучанне прадстаўнікі ўсяго рэгіёна па розных тэрмінах: ад некалькіх тыдняў да некалькіх месяцаў. Па словах дырэктара, праект рэсурснага цэнтра прайшоў абарону ў Міністэрстве адукацыі. Атрыманы першы транш у памеры 700 рублёў, што дае магчымасць закупіць абсталяванне для электра- і аўтамайстэрань. Наступны транш тут плануюць патраціць на электрамабіль, зарадную ўстаноўку і іншае.

### Калі ёсць кантакт

Пры добрым узаемадзеянні навучальнай установы і прадпрыемства кадравая праблема паспяхова вырашаецца. Аб гэтым дэпутатам расказаў **першы намеснік дырэктара — галоўны інжынер філіяла «Гродзенскія электрасеткі» РУП «Гроднаэнерга» Алег ЛЯПЕША**. Па яго словах, за апошнія пяць гадоў толькі ў філіял было прынята каля 20 маладых спецыялістаў, выпускнікоў каледжа. Сёлета працоўныя месцы атрымаюць яшчэ 6 чалавек.

Асноўным кірункам па ўзаемадзеянні з'яўляецца правядзенне як вытворчых практык, так і стажыровак выкладчыкаў навучальнай установы. На прадпрыемства пастаянна паступае новае абсталяванне, з якім знаёміцца прадстаўнікі каледжа.

У сваю чаргу, кіраўнікі філіялаў сістэматычна запрашаюцца ў каледж для ўдзелу ў экзаменацыйных камісіях і абароне дыпломаў. Сёлета паміж электратэхнічным каледжам і філіялам «Гродзенскія электрасеткі» быў падпісаны дагавор аб узаемадзеянні.

— Мы свае дамовы паклалі на паперу, — канстатаваў Алег Ляпеша. — Правялі круглы стол з прадстаўнікамі каледжа, дзе ўзнімаліся пытанні як дзелавога супрацоўніцтва, так і праблемныя моманты па ўзроўні тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі. Акрэслілі сумесныя мерапрыемствы, у тым ліку рэгулярныя экскурсіі навучэнцаў каледжа на прадпрыемства. У сувязі з павышанай бяспекай прымаюцца адпаведныя меры аховы працы. Таму мы выйшлі з прапановай чытаць у каледжы лекцыі па бяспецы на вытворчасці.

### Павялічыць колькасць мэтавікаў

Мэтавая падрыхтоўка — найбольш перспектыўны варыянт замацавання кадраў, лічаць прадстаўнікі адукацыі. У Гродзенскай вобласці штогод выпускаецца звыш 5 тысяч кваліфікаваных рабочых спецыялістаў.

— На працягу апошніх гадоў павялічваецца план прыёму навучэнцаў ва ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. З боку сістэмы адукацыі вядзецца накіраваная работа па падборы абітурыентаў для паступлення ў каледжы на аснове мэтавых дагавораў, — зазначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Руслан АБРАМЧЫК**. — Некаторыя сельгасарганізацыі ўстанаўліваюць стыпендыі для сваіх мэтавікаў на ўвесь перыяд навучання — тры ці дзве базавыя велічыні.

Па словах кіраўніка абласной адукацыі, каледжы зацікаўлены ва ўзаемадзеянні з базавымі арганізацыямі. Наладжана супрацоўніцтва з больш чым 900 заказчыкамі кадраў. Заключана звыш 200 дагавораў аб узаемадзеянні. Для навучэнца складаецца індывідуальна адукацыйны маршрут, ён праходзіць усе віды практыкі на базе замацаванага прадпрыемства.

Як падкрэсліў Руслан Абрамчык, сістэма адукацыі адгукаецца на новыя запыты заказчыкаў кадраў. За апошнія пяць гадоў у рэгіёне адкрыта сем новых спецыяльнасцяў сярэдняй спецыяльнай адукацыі і 15 кваліфікацый прафесійна-тэхнічнага профілю. На базе цэнтраў кампетэнцыі рыхтуюць кваліфікаваных работнікаў і спецыялістаў праз сеткавае навучанне профільных устаноў адукацыі. Для высокатэхналагічных вытворчасцяў вядзецца падрыхтоўка рабочых з высокім узроўнем кваліфікацыі. У 16 навучальных установах ажыццяўляецца эксперыментальна-інавацыйная дзейнасць.

***Маргарыта УШКЕВІЧ,***
***фота аўтара.***

# ВЫШЫНЯ 215 НА КАЛГАСНЫМ ПОЛІ

## Для жыхароў вёсак вахты памяці — шанц даведацца больш пра сваю мясцовасць

**Пошукавікі нярэдка звяртаюцца па дапамогу да насельніцтва, калі праводзяць свае разведкі. І хоць старажылаў, якія бачылі вайну, сёння засталося мала, іх дзеці і ўнукі таксама могуць дапамагчы. Вось і на гэты раз мясцовыя калгаснікі пацвердзілі здагадкі пошукавікаў пра тую вышыню: маўляў, калі аралі поле, звярталі ўвагу на нейкія косці. Цяпер поле калгаснае, а ў 1941-м яно было полем бою. Бітвы, пра якую напісана ў кнігах. Адзінае, што да нядаўняга часу было невядома, дзе тое поле знаходзіцца. Сёлета зоркі сышліся.**

### Лісіныя знаходкі

Асноўнай пляцоўкай пошукаў стала калгаснае поле за два кіламетры ад Шклова, дзе ў ліпені 1941 года праходзілі жорсткія баі паміж падраздзяленнямі 53-й Саратаўскай стралковай дывізіі Чырвонай Арміі і нямецкай дывізіяй СС «Райх».

— Мы пра гэтае месца яшчэ больш чым 20 гадоў таму ведалі, — расказвае **кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба, ваенны пісьменнік Мікалай БАРЫСЕНКА.** — Я тады якраз працаваў над кнігай, дзе гаворыцца ў тым ліку і пра 53-ю Саратаўскую дывізію — «41. Палаючыя рубяжы Дняпра і Сожа». У архіве зводак па дывізіі было няшмат. Але ў 1997 годзе мы ўжо падымалі непадалёк ад гэтага месца трох байцоў — знайшлі выпадкова на краі лесу. Лісы выкапалі норы, і астанкі адкрыліся. На жаль, дакладнай інфармацыі пра месца бою на той момант у нас не было. Прыступаліся да яго некалькі гадоў, а атрымалася знайсці толькі летась. Але я ўжо тады ведаў, што аднойчы ўсё адкрыецца. Дакументы сведчылі: стратэгічная вышыня, ад яе выхад наўпрост на шклоўскі мост.

Летась **камандзір магілёўскай пошукавай групы «Авангард» Ілья ТРЫХАНАЎ** узяўся адпрацаваць тую мясцовасць. Траншэя, якую трэба было знайсці, праходзіла непадалёк ад дарогі. Разам з пошукавікам групы Антонам Пракапнёвым яны абышлі тры палі паміж вёскай Апалонаўкай і Шкловам.

Спачатку ніякіх сігналаў не было, але раптам хлопцы наткнуліся на сляды вайны — каскі, скрыні, потым пайшлі астанкі. Быццам бы рэальнасць пасунулася і яны трапілі ў ліпень 41-га. Звычайна мясцовыя жыхары забітых хаваюць, тут жа ўсё засталося некранутым. Глыбіня залягання забітых была ад паўтара метра да зусім нязначнай — менш ад штыка рыдлёўкі.

— Калі я даведаўся пра гэты бой, зацікавіўся, што ж там адбылося, — расказвае Ілья Трыханаў. — Шукаў інфармацыю паўсюль на працягу трох гадоў. З мёртвай кропкі справа зрушылася, калі купіў нямецкія аэрафотаздымкі ў амерыканскім архіве. Пасля вайны амерыканцы вывезлі нямецкі архіў да сябе. З 15 здымкаў інфарматыўным аказаўся адзін. Ён за 1943 год, але на ім выразна відаць тыя траншэі. Падчас выезду на месца здагадкі пацвердзіліся.

Ілья лічыць, што для Шклова гэта гераічнае месца. Як, напрыклад, для Магілёва — Буйніцкае поле. І вельмі ганарыцца, што яны з Антонам маюць непасрэднае дачыненне да аднаўлення раней невядомай старонкі гісторыі Шклова. Дагэтуль меркавалі, што бой быў дзесьці на заходніх подступах да Шклова. Цяпер дакладна вядома дзе.

### Аднаўленая справядлівасць

Пошукавікі працуюць беспрапынна — у архівах, з насельніцтвам, з электроннымі базамі Міністэрстваў абароны Расіі і Беларусі. Але раскопкі і перапахаванні праводзяцца, толькі калі пацяплее. І выключна з 52-м асобным спецбатальёнам Мінабароны Беларусі. Такі парадак. Сёлета вахта памяці стартавала на мемарыяле «Памяць» у Шклове. На адкрыцці прысутнічалі прадстаўнікі мясцовай улады, дэпутаты, было шмат моладзі.

Разам з пошукавікамі на раскопкі адправіліся група магілёўскіх вучняў на чале з завучам 34-й школы Галінай Бяляевай і навучэнцы Шклоўскага ліцэя. Падлеткі былі задзейнічаныя на дапаможных работах, назіралі, як працуюць вопытныя пошукавікі. На гэты раз знаходкі былі фантастычныя. У першыя два дні атрымалася падняць астанкі 19 чалавек, і ўсіх з медальёнамі! Мікалай Барысенка кажа, што такога, каб у кожнага з паднятых быў медальён, не здаралася за ўсю гісторыю існавання клуба.

— Яны ўсе героі, — не сумняваецца пошукавік. — У кнізе расійскага гісторыка Рамана Памнарэнкі «Дывізія СС «Райх». Марш на ўсход 1941—1942» ёсць успаміны немцаў пра гэты бой. Ён быў вельмі жорсткі. Там так і напісана, што кожны метр немцам прыходзілася пераадольваць пад моцным агнём. Некалькі спроб прарваць савецкія лініі на вышыні 215 скончыліся няўдачай. Цяжкі бой спыніўся толькі з надыходам цемры. Усё падраздзяленне загінула. І немцы сведчаць, што пакуль усіх чырвонаармейцаў не перабілі, не маглі крануцца з месца. Нашы абаронцы як сталі ў траншэі, так і засталіся там да канца. І толькі калі загінулі, немцы змаглі ўвайсці ў Шклоў.



**Начальнік штаба абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру», метадыст Магілёўскага абласнога цэнтра творчасці Святлана БАРЫСЕНКА** асабліва трапятліва ставіцца да памяці.

— Вельмі прыкра, што 80 гадоў байцы застаюцца ляжаць на палях нязнойдзенымі, непахаванымі, неаплаканымі, — кажа яна. — Родныя чакаюць іх дагэтуль. Сведчаннем таму сотні лістоў, якія прыходзяць на электронную пошту клуба. Я спадзяюся, што агульнымі сіламі мы зробім усё, каб вярнуць салдат у сем'і. Ветэраны сышлі, цяпер памяць даверана нам, пошукавікам. Падмурак любой дзяржавы трымаецца на памяці. І мы робім усё, каб яе захаваць. Нашы рабяты ахвяруюць водпускам, жывуць у экспедыцыях на поўным самазабеспячэнні, працуюць на раскопах з раніцы да вечара. І ўсё дзеля таго каб вярнуць яшчэ хоць бы адно імя. Родныя іх чакаюць. І хтосьці абавязкова вернецца.

### Дзеля памяці

Падчас Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Шклоўскага раёна загінула 13 тысяч савецкіх воінаў і мірных жыхароў. Пра гэта сёння нагадвае каля сямі дзясяткаў воінскіх пахаванняў, дзе ляжыць больш як дзве тысячы чырвонаармейцаў і ахвяр фашызму.

— Пошукавікі робяць вялікую справу па аднаўленні імёнаў герояў Вялікай Айчыннай вайны, — лічыць **намеснік старшыні Шклоўскага райвыканкама Аляксандр ДАВЫДОВІЧ.** — І мы вельмі ўдзячныя, што такая вахта праходзіць і на нашай зямлі. Час бяссільны перад памяццю. Памяць, якая жыве ў нашых сэрцах, не дазволіць тым, хто наблізіў Перамогу, знікнуць у вечнасці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара і Святланы БАРЫСЕНКІ,**
*г. Шклоў.*



### Меркаванне

— Мы ўсяк садзейнічаем пошукавікам у іх рабоце, бо тое, што яны робяць, вельмі патрэбнае для захавання гістарычнай памяці. Каб нашы дзеці і ўнукі ведалі, што такое фашызм і яго наступствы, — адзначае **старшыня Шклоўскага райсавета Аксана ПАДХАЛЮЗІНА**. — У мяне двое ўнукаў, я іх таксама хацела б далучыць да гэтай работы, але ім трэба крыху падрасці. Узроставы цэнз з 16 гадоў, а ім яшчэ па 12. Але я вельмі хачу, каб яны прычыніліся да высакароднай справы. Калі ты сваімі рукамі дакранаўся да гісторыі, калі бачыў на сваё вочы сляды вайны, ты ўжо ніколі тое не забудзеш. Гэта самы надзейны спосаб стаць патрыётам. Вайна адарвала чалавека ад сям'і, забрала яго жыццё. Прайшло шмат часу, а родныя па-ранейшаму не ведаюць, дзе ляжыць дзед, прадзед. І прынесці ў іх дом добрую вестку — значыць аднавіць справядлівасць. Мясцовыя жыхары заўсёды ахвотна дзеляцца сваімі ўспамінамі, перадаюць словы сваіх землякоў і родных, якія жылі ў той час. Цяпер шмат адкрываецца новых старонак. Калі пракуратура займалася пошукам новых звестак пра зверствы фашыстаў, ёй таксама дапамагала насельніцтва. Старыя людзі памятаюць, дзе затануў танк, куды ўпаў самалёт, дзе пахавалі забітых байцоў або мірных жыхароў. Сельскія арганізацыі, школы, калгасы даглядаюць воінскія пахаванні, гэта наш унёсак у агульную справу. Для мяне асабіста ваенная тэма вельмі блізкая. Мая бабуля Зінаіда Казлоўская ваявала ў партызанскім атрадзе Канстанціна Заслонава на Аршаншчыне, нават мела баявыя ўзнагароды. Ёй было ўсяго 16 гадоў, а яна ўжо з іншымі падлеткамі збірала інфармацыю пра немцаў і перадавала партызанам. Калі тыя даведаліся, схапілі юных патрыётаў. Але іх вызвалілі партызанкі. Я ганаруся, што ў мяне была такая баявая бабуля. Наогул, толькі такі гераічны народ, як наш, і мог выйграць у той страшнай вайне.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 10.363. Нумар падпісаны ў 19.30 6 чэрвеня 2023 года.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов по продаже имущества ОАО «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ» в форме открытого аукциона

| № Лота | Наименование предмета торгов | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. (10 %) | Шаг аукциона, бел. руб. (5 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Бензопила Husqvarna 365-15 (без шин), инв. 505 | 288,00 | 28,80 | 14,40 |
| 2 | Вибратор, инв. 146 | 90,00 | 9,00 | 4,50 |
| 3 | Генератор сварочный EP200X-XC-200АД (только двигатель), инв. 434 | 522,00 | 52,20 | 26,10 |
| 4 | Дрель ударная GSB 19-2 RE (н/раб), инв. 756 | 60,00 | 6,00 | 3,00 |
| 5 | Компрессор Profi 320-10 100-1, инв. 736 | 246,00 | 24,60 | 12,30 |
| 6 | Компьютер CDL с монитором «Самсунг», клавиатура системник (н/раб), инв. 708 | 49,80 | 4,98 | 2,49 |
| 7 | Компьютер монитор «Самсунг» 795, инв. 436 | 25,80 | 2,58 | 1,29 |
| 8 | Компьютер, инв. 525 | 31,80 | 3,18 | 1,59 |
| 9 | Контейнер для кислор. баллонов, инв. 145 | 78,00 | 7,80 | 3,90 |
| 10 | Насос ГНОМ 16-16 220В Литва, инв. 790 | 66,00 | 6,60 | 3,30 |
| 11 | Нивелир НИ-3 (н/раб), инв. 419 | 108,00 | 10,80 | 5,40 |
| 12 | Нивелир НИ-3 (н/раб), инв. 606 | 52,80 | 5,28 | 2,64 |
| 13 | Нивелир (н/раб), инв. 597 | 52,80 | 5,28 | 2,64 |
| 14 | Нивелир (н/раб), инв. 60048-а | 59,40 | 5,94 | 2,97 |
| 15 | Ноутбук 15,6 «Самсунг» 305E5Z РФ, инв. 761 | 120,00 | 12,00 | 6,00 |
| 16 | Ноутбук 15,6 «Самсунг» 305E5Z серебр. РФ, инв. 746 | 120,00 | 12,00 | 6,00 |
| 17 | Опалубка монолитных стен Конте РФ, инв. 782: 1. щит 3000х1200 мм (49 шт). 2. щит 3000х1100 мм (1 шт.). 3. щит 3000х1000 мм (3 шт.). 4. щит 3000х900 мм (1 шт.). 5. щит 3000х800 мм (2 шт.). 6. щит угловой (4 шт.). 7. анкер торцевой (4 шт.). 8. болт стяжной SAS15FC (96 шт.). 9. гайка стяжная оц 90 мм (190 шт.). 10 замок клиновый (75 шт.). 11. замок универс оц (55 шт.). 12. захват крановый «Гамма» (2 шт.). 13. кронштейн подмостей (25 шт.) | 4193,10 | 419,31 | 209,66 |
| 18 | Отбойный молоток SDS-max «Макита» Литва (н/раб), инв. 706 | 162,00 | 16,20 | 8,10 |
| 19 | Перфоратор GBH 4-32 DFR Герм (н/раб), инв. 777 | 222,00 | 22,20 | 11,10 |
| 20 | Перфоратор SDS plus GBH 4-32 Герм (н/раб), инв. 728 | 144,00 | 14,40 | 7,20 |
| 21 | Перфоратор SDS plus Bosch GBH 2-28 DFV Герм (н/раб), инв. 753 | 60,00 | 6,00 | 3,00 |
| 22 | Перфоратор SDS plus Bosch GBH 4-32 DFR Герм, инв. 719 | 222,00 | 22,20 | 11,10 |
| 23 | Пила цепная эл. «Макита» UC4020F 1800 Вт попереч. двиг. н (н/раб), инв. 647 | 30,60 | 3,06 | 1,53 |
| 24 | Подъемник к-1, инв. 140 | 330,00 | 33,00 | 16,50 |
| 25 | Подъемник к-1, инв. 302 | 330,00 | 33,00 | 16,50 |
| 26 | Полуавтомат МИДИ Макстер 1800, инв. 501 | 300,00 | 30,00 | 15,00 |
| 27 | Пуско-зарядное устройство 24-12 Вт, инв. 638 | 120,00 | 12,00 | 6,00 |
| 28 | ПЭВМ Сильверадо (мышь, монит. 19, клав) без сист. комплект, инв. 500 | 23,40 | 2,34 | 1,17 |
| 29 | Сварочный агрегат (н/раб), инв. 530 | 126,00 | 12,60 | 6,30 |
| 30 | Смеситель EM1-950K (н/раб), инв. 629 | 66,00 | 6,60 | 3,30 |
| 31 | Телефакс, инв. 98 | 7,20 | 0,72 | 0,36 |
| 32 | Теодолит 3Т5КП (н/раб), инв. 794 | 306,00 | 30,60 | 15,30 |
| 33 | Углошлифмашинка «Макита» GA50301 (н/раб), инв. 657 | 34,80 | 3,48 | 1,74 |
| 34 | Транспортер, инв. 407 | 456,00 | 45,60 | 22,80 |
| 35 | УШМ двуручная GWS 22-230 H Bosch (н/раб), инв. 653 | 31,20 | 3,12 | 1,56 |
| 36 | Шлагбаум ASB600 Китай, инв. 760 | 252,00 | 25,20 | 12,60 |
| 37 | Котел отопительно-водогрейный, инв. 65 | 510,00 | 51,00 | 25,50 |
| 38 | Экскаватор ЭО-26-21 (на запчасти) | 2400,00 | 240,00 | 120,00 |
| 39 | Станок токарно-винторезный инв. № 37882 | 756,00 | 75,60 | 37,80 |
| 40 | Станок фуговальный инв. № 37883 | 277,20 | 27,72 | 13,86 |
| 41 | Станок лесопильный инв. № 37881 | 211,20 | 21,12 | 10,56 |
| 42 | Имущество, согласно списку № 1: https://docs.google.com/document/d/10hhmUCHJEaF-grL8W6ro54bLs4rESFdz/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 388,44 | 38,84 | 19,42 |
| 43 | Имущество согласно списку № 2: https://docs.google.com/document/d/1TZ6DIdAX3VN93T4FOyH4T1ciBpVu-C0G/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 1372,49 | 137,25 | 68,62 |
| 44 | 1. Гигром. психометр (госповерка). 2. Гигрометр (РФ)д/измер. влажн. стр. мат. Testo 606-1. 3. Гигрометр психометрический ВИТ-1 (госповерка). 4. Измеритель влажн. матер. | 345,60 | 34,56 | 17,28 |
| 45 | 1. Дорожные плиты, 4 шт. 2. ЗПБ 16-37п. 3. КЦ 10-6. 4. ПК 24.12.4. 5. ПК 27.12.8. 6. ПТМ72.15.22-8,0 S800-2а (плиты пустотного настила), 2 шт. 7. ПТМ75.12.22-8,0 S800 3а | 1363,20 | 136,32 | 68,16 |
| 46 | Имущество согласно списку № 3: https://docs.google.com/document/d/1pcqR_6xO9IUEAzuaZs2ftBj5O3OOJ2h1/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 619,20 | 61,92 | 30,96 |
| 47 | 1. Дальномер лазерный GLM 80 BOSCH (рулетка эл.). 2. Эл. уровень | 314,40 | 31,44 | 15,72 |
| 48 | 1. Шпилька 12х2000 рез. Штанга, 0,003 т. шт. 2. Шпилька резьбовая 16х2000, цинк, 0,036 т. шт. 3. Шпилька резьбовая цинк 6х2000,0.002 т. шт. 4. Шпилька резьбовая цинк 8х1000,0,002 т. шт. | 320,40 | 32,04 | 16,02 |
| 49 | 1. Домкрат 111-3913010 (25 тонн). 2. Домкрат 12-3913010 | 1357,20 | 135,72 | 67,86 |
| 50 | 1. Каска защ. СОМ3-55, 3 шт. 2. Каска защитная Б. б/у. 3. Каска-бейсболка «Каскетка», цв. син., 2 шт. 4. Халат жен. «Гренада». 5. Кепи-бейсболка | 37,20 | 3,72 | 1,86 |
| 51 | Имущество согласно списку № 4: https://docs.google.com/document/d/14qYa5M3qIYWZZZqThxOXUSnGxrLUvh4B/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 598,08 | 59,81 | 29,90 |
| 52 | 1. Миксер-дрель МД1-11Э (1100 Вт) без насадки «Фиолент». 2. Шнур каменщика 30 м (госповерка). 3. Штангенциркуль ШЦ-II-250 (0,05) (госповерка). 4. Кельма из нерж. стали 160 мм. 5. Емкость строит. круглая 45 л. 6. Шлифшкурка на бум. основе (рулон 115 мм х 50 м), 22 м. п. 7. Тачка строит. ТС-2. 8. Ножницы по металлу 260 мм прямые. 9. Ножовка для газобетона 630 мм, 34 тверд., 2 шт. 10. Молоток-кирка 0,7 кг дер. ручка | 370,80 | 37,08 | 18,54 |
| 53 | 1. Перчатки диэлектр. бесшовные, 2 пары. 2. Розетка 1-гнезд. с/заз. 3. BYLECTRICA откр. уст. белая. 4. Розетка на удлинитель 1-гнезд. переносная, каучук. 5. Розетка силовая PE 5х32A 3P+PE+N с креплением. 6. Удлинитель 3-фазный ПВС 5х4. 7. Удлинитель L=10 м. 8. Удлинитель L=20 м, 2 шт. 9. Удлинитель L=40 м. 10. Удлинитель У10-001 10 м, 3 шт. 11. Разъем сил. вилк. 3SP1-024 63A. 12. Разъем силовой HT-025 32A. 13. Разъем силовой HT-125 32A, 2 шт. 14. Провод ПВС 3х2,5 (м), 31 м. 14. Провод ПВС 5х4 (м), 42 м. 15. Стартер ST 111 BASIC смол., 24 шт. 16. Разъем РШ/ВШ-30, 11 шт. | 555,60 | 55,56 | 27,78 |
| 54 | 1. Форма куба 3ФК-100 (госповерка). 2. Форма куба 3ФК-100 (госповерка). 3. Форма куба 3ФК-100 (госповерка) | 360,00 | 36,00 | 18,00 |
| 55 | 1. Стол компьютерный. 2. Стол письменный 2-тумб. зак., 2 шт. 3. Стол приставка заказная 1,0, 2 шт. 4. Шкаф 47х40х217 | 202,80 | 20,28 | 10,14 |
| 56 | 1. Тел. сот. Nokia x2-02 RM-694. 2. Факс Panasonic KX-FT 982 RU-B | 136,80 | 13,68 | 6,84 |
| 57 | 1. Щит учета (зд. проходной). 2. Щит учета № 1. 3. Щит учета № 2. 4. ЩУРН-3ф передвижной с ДМ. 5. Трансформатор | 291,60 | 29,16 | 14,58 |
| 58 | 1. Эл. чайник «Люкс» 1.7 л. 2. Электрочайник «Атлант»1,8/1,9-220 ЭЧТЗ с д/м. 3. Электрочайник «Атлант» 1,8/1,9-220 ЭЧТЗ с д/м. 4. Электрочайник Polly № 1,7 л с сигнал. «Рубин» (нерабочий). 5. Электрочайник ЭЧТЗ1,8/1,9-220 01 «Атлант» с д/м н/р. 6. Мешки пылесб. ECO-104 к пылесосам BOSCH PAS, 4 шт. 7. Замок врезной мод. Ш 025Б. 8. Гладилка швейц.13х58. 9. Обогреватель электр. масл. 1,5 кВт. 10. Печь СВЧ «HORIZONT» 17 MW700-1378B, 2 шт. | 358,80 | 35,88 | 17,94 |
| 59 | 1. Стол письмен. с приставкой. 2. Стол прист. заказ. 0,9х0,45. 3. Стол приставка заказная 0.6 | 256,80 | 25,68 | 12,84 |
| 60 | 1. Электродвигатель АИР 100S4. 2. Электродвигатель ИВ-117-2 | 348,00 | 34,80 | 17,40 |
| 61 | 1. Чайник электрич. POLLY-Люкс. 2. Чайник электрич. POLLY-Люкс ЕК-20. 3. Чайник электрич. POLLY-Люкс ЕК-20. 4. Чайник электрич. ЭЧТЗ 1,8/1,9-220 мод.01 «Атлант». 5. СВЧ-печь. 6. Рукосушитель автоматический | 217,20 | 21,72 | 10,86 |
| 62 | Теодолит 3т 5КП № 36056 | 1680,00 | 168,00 | 84,00 |
| 63 | 1. Струбцина ленточн. для стяжки полов 120х5000, 2 шт. 2. Съемник проф. 300 мм. 3. Тачка WB5009 R. 4. Тиски для труб № 2 б/у. 5. Толщиномер неотвердевшего слоя Константа ГЗ(ГП). 6. Топор А-0 0,9 кг в сборе 1,2 кг. 7. Топор метал. с дерев. топорищ. 10514. 8. Траверса. 9. Траверса. 10. Набор щупов (госповерка). 11. Насос электр. профес. погружной. 12. Ножницы по мет. 260 мм. 13. Кувалда 3 кг | 310,8 | 31,08 | 15,54 |
| 64 | 1. Углометр с нониусом (РФ) 4УМ (10') (госповер). 2. Угольник слесар. 160х100 3 кл. 3. Угольник столярный 1000 мм. 4. Рулетка 3 м (госповерка) | 501,60 | 50,16 | 25,08 |
| 65 | 1. Теодолит 2 т 30П № 09628. 2. Рейка измерительная GR500 TELESKOP-NIV, BOSCH | 796,80 | 79,68 | 39,84 |
| 66 | 1. Сканер Epson Perfection V33 Финляндия. 2. Сот. тел. Nokia 359033044101168. 3. Стул PR ST Pt. 4. Сумка для ноутбука 15,6", 3 шт. 5. Излучатель эл. инфракр., 2 шт. | 266,40 | 26,64 | 13,32 |
| 67 | 1. Труба в\ст 5005 п\э, 8.24 м. 2. Труба водосточная, 4 шт. 3. Рукав 111-9-2.0, 40 м. п. 4. Отвод желоба ОЖВ120/О-Пэ-С. 5. Отвод желоба ОЖВ150/О-Пэ-С, 2 шт. 6. Манометр МП-50. 7. Манометр МП-63. 8. Клапан обратный. 9. Водомерный узел | 144,56 | 14,46 | 7,23 |
| 68 | 1. Сварочный аппарат JASIC ARC 200. 2. Резак проп. Р1 «Донмет» 142. 3. Резак проп. РС-3П-100 (9/9) «РО-АР». 4. Регулятор РДСГ 1-0,5 (50 л). 5. Редуктор БКО-50-4м кислород. 6. Щиток защит. лиц. для электросвар., 2 шт. 7. Маска (щиток) сварщика ННП-У1. 8. Редуктор углекислотный УР-6-6. 9. Подогреватель ПУ-1(для подогрева углекислоты) | 372,00 | 37,20 | 18,60 |
| 69 | 1. Замок клиновый, 75 шт. 2. Замок универс оц, 55 шт. 3. Кронштейн подмостей, 25 шт. | 1296,00 | 129,60 | 64,80 |
| 70 | Имущество, согласно списку № 5: https://docs.google.com/document/d/1I3vPdVS8bAXiRVgH6-J50hWNstVovCuy/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 643,92 | 64,39 | 32,20 |
| 71 | Лист проф. гладк. П-1250xL/0,5-ЛКПЦ-Пэ-С-RAL9003, 1.25 м² | 9,00 | 0,90 | 0,45 |
| 72 | 1. Захват для бордюр, 3 шт. 2. Захват крановый «Гамма», 2 шт. | 590,40 | 59,04 | 29,52 |
| 73 | Жидкотопливный воздухонагреватель МАК 25 | 924,00 | 92,40 | 46,20 |
| 74 | 1. Дрель GBM 10-2 RE (БЗП). 2. Дверной блок ДГФ 2,1х1,0 межкомнатный. 3. Диск 190х2,0х30 мм. 4. Заклепка 4,0х8 ZK алюм/ст, 0.23 т. шт. 5. Заклепочник 250 мм. 6. Абраз. сетка 115/280 (50 шт.), 2 упак. 7. Вибронаконечник к ИВ-117 ф51. 8. Бур садовый ф250. 9. Ведро пожарное, 2 шт. 10. Грунтовка белая Тайфун мастер № 100, 10 кг. 11. Лампа паяльная 1,5 л, 2 шт. 12. Припой ПОС-61 ф3 мм (фас 1 кг), 0.6 кг. 13. Уровень MAAN 1200 мм. 14. Уровень брусковый 1,0 м. 15. Огнетушитель ОП-4(3), 3 шт. 16. Огнетушитель ОП-5, 2 шт. | 697,32 | 69,73 | 34,87 |
| 75 | Измеритель адгезии АР (решетка) | 504,00 | 50,40 | 25,20 |
| 76 | 1. Кресло Престиж, 5 шт. 2. Полка навесная | 326,40 | 32,64 | 16,32 |
| 77 | Печь отопительно-варочная НОРМАЛЬ-2 антрацит. труб | 252,00 | 25,20 | 12,60 |
| 78 | Имущество, согласно списку № 6: https://docs.google.com/document/d/1NJLLpjwfAkJpMzz_yEL2Kkdh-a_g-Cdd/edit?usp=drive_link&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true | 1262,79 | 126,28 | 63,14 |

В отношении лотов №№ 1–37 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 50 %.**
В отношении лота № 38 проводятся вторые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 20 %.**
В отношении лотов №№ 39, 40 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 70 %.**
Публикация об аукционе ранее размещалась в газете «Звязда» № 57 (29937) от 25.03.2023, стр. 10.
В отношении лота № 41 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость имущества снижена на 60 %.**
Публикация об аукционе ранее размещалась в газете «Звязда» № 96 (28963) от 25.05.2019, стр. 5.
В отношении лотов №№ 42-78 проводятся первые торги

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения открытого аукциона** | **21 июня 2023 года в 12.00 (по лотам №№ 1–42) регистрация с 11.30 до 11.55**<br>**11 июля 2023 года в 12.00 (по лотам №№ 43–78) регистрация с 11.30 до 11.55**<br>по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | **с 10.00 07.06.2023 до 16.00 19.06.2023 (по лотам №№ 1–42)**<br>**с 10.00 07.06.2023 до 16.00 07.07.2023 (по лотам №№ 43–78)**<br>по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Местонахождение имущества** | Лоты №№ 1–37, 42–78: г. Гродно, ул. Дубко, д. 11<br>Лоты №№ 38–41: г. Гомель, ул. Пригородная, 31 |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту ___, ОАО «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ», проводимых __.__.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по тел.: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % (семь процентов) от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания договора.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться по телефону: по лотам №№ 1–37, 42–78 +375 29 589 41 34 Ольга Михайловна; по лотам №№ 38–41 +375 29 304 59 90, Дарья.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, демонтажом и вывозом (в том числе при наличии технических препятствий) осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Продавец** | **Открытое акционерное общество «ТРЕСТ БЕЛСТРОМРЕМОНТ» (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», +375 29 304 59 90, 8017 255 29 28)** |
| **Организатор торгов** | **ООО «Фрондера»: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт: orgtorg.by 220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 1, офис 1127** |

## БРЕСТСКИЙ ФИЛИАЛ РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Лот: изолированное помещение с инвентарным номером 121/D-3677 (наименование: квартира № 2; назначение: квартира), площадью 25,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Дрогичинский с/с, д. Нагорье, ул. Железнодорожная, д. 71, кв. 2**

| Начальная цена, руб. | 3 004,32 | Размер задатка, руб. | 300,43 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** РСУП «Брестплемпредприятие», г. Брест, ул. Карбышева, 35, тел. 80162530948. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф. 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** возможно предоставление рассрочки оплаты стоимости имущества в случае подачи заявления. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 10 % от предыдущей названной цены.

**Аукцион состоится 22 июня 2023 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе; порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by/auction/16213), а также ее можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**

**Последний день приема заявлений – 21 июня 2023 г. до 17.00**

Краіна здароўя
Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

# НЕСАЛОДКІЯ ІСЦІНЫ

## Эндакрынолаг пра тое, як не прапусціць сімптомы цукровага дыябету і як спыніць захворванне

**Цукровы дыябет — самае распаўсюджанае эндакрыннае захворванне. Пры развіцці гэтага метабалічнага парушэння змяняюцца ўсе органы і сістэмы арганізма, павялічваецца рызыка сардэчна-сасудзістых і іншых захворванняў. Што можна і чаго нельга есці пры цукровым дыябеце, ці можа ён быць бессімптомным, ці патрэбны нам увогуле цукар і якую фізічную актыўнасць падтрымліваць? На гэтыя і іншыя пытанні адказала ўрач-эндакрынолаг 11-й гарадской паліклінікі Мінска Таццяна ПЛОТНІКАВА.**

***— Таццяна Аляксееўна, цяпер шмат кажуць, што цукровы дыябет памаладзеў. У колькі звычайна на яго захворваюць?***

— Цукровы дыябет — гэта захворванне, якое характарызуецца павышаным узроўнем глюкозы ў крыві. Адзначаецца штогадовы рост колькасці людзей з цукровым дыябетам 2 тыпу, што з'яўляецца сацыяльна значнай праблемай. Раней лічылася, што на цукровы дыябет 2 тыпу хварэюць пераважна людзі, старэйшыя за 40—45 гадоў. Аднак у апошнія гады гэты тып дыябету значна «памаладзеў», што звязана з высокай распаўсюджанасцю атлусцення, у тым ліку ў дзяцей і падлеткаў.

***— Як не прапусціць сімптомы цукровага дыябету? Ці праўда, што захворванне можа праходзіць без сімптомаў?***

— Неабходна разумець: чым раней выяўлены цукровы дыябет і своечасова пачата лячэнне, тым больш спрыяльны прагноз. На жаль, на ранніх стадыях і пры нязначных ваганнях глюкозы цукровы дыябет 2 тыпу можа працякаць бессімптомна. З прагрэсіраваннем захворвання і ростам узроўню глюкозы з'яўляюцца сімптомы.

**Цукровы дыябет 2 тыпу мае генетычную схільнасць. У спадчыну перадаецца не само захворванне, а схільнасць да яго. Калі хварэе адзін з бацькоў, то верагоднасць развіцця цукровага дыябету 2 тыпу складае 40 %, а калі абое — 75 %.**

Чалавек можа адчуваць слабасць, зніжэнне працаздольнасці, пачашчанае мочаспусканне, смагу, сухасць у роце, зніжэнне масы цела, павышаны апетыт, сухасць і сверб скуры, гнайнічковыя высыпанні на скуры, складанасць загойвання скурных пашкоджанняў, зніжэнне вастрыні зроку, схільнасць да частых інфекцыйных захворванняў. Пры з'яўленні сімптомаў неабходна неадкладна звярнуцца да ўрача.

***— Якія фактары рызыкі развіцця захворвання?***

— Да іх адносяць лішнюю масу цела або атлусценне; узрост, старэйшы за 45 гадоў; цукровы дыябет у сваякоў першай ступені сваяцтва; наяўнасць артэрыяльнай гіпертэнзіі ці іншых сардэчна-сасудзістых захворванняў; павышаны ўзровень халестэрыну або трыгліцэрыдаў; звыкла нізкую фізічную актыўнасць (менш за 30 хвілін у дзень).

Таксама ў групе рызыкі жанчыны, якія мелі дыягназ «гестацыйны цукровы дыябет» ці якія нарадзілі дзіця з масай цела больш за 4 кг і жанчыны з сіндромам полікістозных яечнікаў.

Для ўсіх асоб, якія маюць хаця б адзін з фактараў рызыкі, павінен праводзіцца скрынінг для ранняга выяўлення цукровага дыябету. Гэтак жа для ацэнкі 10-гадовай рызыкі развіцця цукровага дыябету 2 тыпу выкарыстоўваецца шкала FINDRISC.

***— Якая роля генетычнага фактару? Якая верагоднасць перадачы цукровага дыябету ад бацькоў?***

— Цукровы дыябет 2 тыпу мае генетычную схільнасць. У спадчыну перадаецца не само захворванне, а схільнасць да яго. Калі хварэе адзін з бацькоў, то верагоднасць развіцця цукровага дыябету 2 тыпу складае 40 %, а калі абое — 75 %. Аднак для праяўлення хваробы неабходна наяўнасць дадатковых фактараў рызыкі, якія будуць садзейнічаць яе развіццю. Важна ўлічваць той факт, што развіццё дыябету шмат у чым залежыць ад ладу жыцця самога чалавека.



***— Якая норма цукру ў крыві? І што такое пераддыябет?***

— Нармальным узроўнем лічыцца глюкоза нашча менш за 5,6 ммоль/л па суцэльнай капілярнай крыві, менш за 6,1 — па плазме вянознай крыві. Стан, пры якім з'яўляюцца нязначныя ваганні ўзроўняў глюкозы крыві, вышэйшыя за нармальныя, але яны не дасягаюць дыягнастычных крытэрыяў цукровага дыябету, — пераддыябет. Ён папярэднічае дыябету, і ўжо на дадзеным этапе чалавек мае рызыкі развіцця сардэчна-сасудзістых ускладненняў, у тым ліку інфарктаў і інсультаў.

Важна адзначыць, што гэты стан абарачальны. Менавіта на этапе пераддыябету неабходна прыняць усе меры, каб прадухіліць развіццё цукровага дыябету. Для пераддыябету характэрныя наступныя лабараторныя паказчыкі: глюкоза нашча 6,1—6,9 ммоль/л (плазма вянознай крыві), 5,6—6,0 ммоль/л (суцэльная капілярная кроў); глюкоза праз дзве гадзіны пасля нагрузкі 75 г глюкозы 7,8—11,0 ммоль/л; глікаваны гемаглабін 6,0—6,4 %.

***— Ці праўда, што захворванню спрыяюць частыя перакусы, якія вядуць да інсулінарэзістэнтнасці, і каб знізіць рызыку, есці трэба не больш за 3-4 разы ў суткі?***

— У аснове развіцця цукровага дыябету 2 тыпу ляжыць інсулінарэзістэнтнасць — гэта зніжэнне адчувальнасці тканак арганізма да дзеяння інсуліну. Асноўнай і найбольш частай прычынай развіцця інсулінарэзістэнтнасці з'яўляецца лішняя маса цела і атлусценне (яго вісцэральны тып — назапашванне тлушчавых клетак вакол і ўнутры ўнутраных органаў). Такім чынам, прафілактыка інсулінарэзістэнтнасці — гэта падтрыманне нармальнай масы цела за кошт захавання збалансаванага паўнавартаснага харчавання з абмежаваннем лёгказасваяльных вугляводаў, насычаных тлушчаў і падтрымання дастатковага ўзроўню фізічнай актыўнасці.

***— Што такое рэмісія пры цукровым дыябеце і як яе дасягнуць? Ці можна спыніць развіццё цукровага дыябету і што для гэтага трэба рабіць?***

— У 2009 годзе Амерыканская асацыяцыя дыябету ўпершыню апісала тэрмін «рэмісія цукровага дыябету 2 тыпу». Ён азначае захаванне нармальнага ўзроўню глюкозы пры поўнай адмене цукровазніжальнай тэрапіі. Крытэрыем кантролю служыць узровень глікаванага гемаглабіну менш за 6,5 %. Даказана, што для дасягнення рэмісіі ў пацыентаў з цукровым дыябетам 2 тыпу, якія маюць лішнюю масу цела або атлусценне, асноўнай умовай, бадай, з'яўляецца зніжэнне і нармалізацыя масы цела з наступным яе ўтрыманнем.

Для дасягнення гэтай мэты рэкамендаваны наступныя метады: немедыкаментозная тэрапія (карэкцыя харчавання і павелічэнне фізічнай актыўнасці), пры наяўнасці паказанняў і адсутнасці супрацьпаказанняў могуць быць выкарыстаны медыкаментозная тэрапія і барыятрычная хірургія. Клінічна значным лічыцца зніжэнне масы цела на 5—10 % на працягу 3—6 месяцаў з наступным яе ўтрыманнем. Пры гэтым хуткасць зніжэння масы цела не павінна перавышаць больш за 0,5—1,0 кг у тыдзень.

***— А ўвогуле, ці неабходны нашаму арганізму цукар? Ці трэба змагацца, калі да яго сфарміравалася залежнасць, і як яе вызначыць?***

— У цяперашні час існуе праблема спажывання вялікай колькасці цукру ў ежу, што прыводзіць да значнага росту атлусцення. Вядома ж, вугляводы неабходныя нашаму арганізму. Яны з'яўляюцца асноўнай крыніцай энергіі. Вугляводы павінны складаць да 50—60 % сутачнага рацыёну, але яны павінны быць перш за ўсё павольна засваяльнымі.

Згодна з рэкамендацыямі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ), спажыванне цукру павінна быць на ўзроўні менш за 5 % ад агульнай колькасці штодзённа спажываных калорый (эквівалентна прыкладна 25 грамам цукру, або 6 чайным лыжкам) у дзень для дарослага чалавека з нармальным індэксам масы цела. СААЗ лічыць, што зніжэнне спажывання цукру да 25 г у дзень (з улікам усіх відаў цукру, якія чалавек дадае сам у ежу і «схаванага» цукру, які ўжо змяшчаецца ў прадуктах харчавання, — фруктовых соках, кандытарскіх вырабах, падліўках і інш.) знізіць узровень атлусцення і распаўсюджанасць захворванняў зубоў.

Пры ўжыванні вялікай колькасці цукру ў чалавека з'яўляецца пастаянная цяга да салодкага: яму хочацца салодкага, нават калі ён не галодны, або пасля прыёму ежы яму абавязкова трэба з'есці салодкі дэсерт, або ён увесь час выкарыстоўвае салодкае для заядання стрэсу ці якой-небудзь непрыемнай падзеі.

***— Калі пры цукровым дыябеце 2 тыпу прызначаюць інсулін? Што да гэтага прыводзіць?***

— На розных этапах лячэння цукровага дыябету 2 тыпу можа быць рэкамендавана інсулінатэрапія. Асноўнымі паказаннямі да прызначэння інсуліну з'яўляюцца дэкампенсацыя ўпершыню выяўленага цукровага дыябету, неэфектыўнасць таблетаваных цукразніжальных прэпаратаў, наяўнасць медыцынскіх супрацьпаказанняў да прызначэння або непераноснасць таблетаваных цукразніжальных прэпаратаў. Пры правядзенні хірургічных умяшанняў, пры вострых станах можа прызначацца часовая інсулінатэрапія.

***— Якія самыя небяспечныя ўскладненні цукровага дыябету?***

— Цукровы дыябет 2 тыпу развіваецца павольна і на ранніх этапах бессімптомна, таму ў многіх выпадках дыягнастуецца на позніх стадыях — на этапах ускладненняў. Вылучаюць вострыя (гіпаглікемічная і гіперглікемічная комы) і хранічныя (позняя) ускладненні. Да позніх ускладненняў адносяць дыябетычную рэтынапатыю — пашкоджанне сасудаў сятчаткі вачэй, якое прыводзіць у канчатковым выніку да слепаты; дыябетычную нефрапатыю — пашкоджанне сасудаў нырак і, як вынік, развіццё ныракчнай недастатковасці; дыябетычную нейрапатыю і ангіяпатыю, якія могуць прывесці да развіцця сіндрому дыябетычнай ступні, а пры несвоечасовым або няправільным лячэнні — да гангрэны; сардэчна-сасудзістыя ўскладненні — інфаркты, інсульты; заўчасную смерць.

***— Якой мусіць быць прафілактыка захворвання?***

— Яна заключаецца ў падтрыманні нармальнай масы цела за кошт захавання асноўных прынцыпаў здаровага ладу жыцця.

**«На ранніх стадыях цукровы дыябет 2 тыпу можа працякаць бессімптомна. З прагрэсіраваннем захворвання з'яўляюцца сімптомы.Чалавек можа адчуваць слабасць, зніжэнне працаздольнасці, пачашчанае мочаспусканне, смагу, сухасць у роце, зніжэнне масы цела, павышаны апетыт, сухасць і сверб скуры, гнайнічковыя высыпанні на скуры, складанасць загойвання скурных пашкоджанняў, зніжэнне вастрыні зроку, схільнасць да частых інфекцыйных захворванняў. Пры з'яўленні сімптомаў неабходна неадкладна звярнуцца да ўрача».**

Рэкамендавана абмяжоўваць спажыванне цукру да 25 г у суткі і солі да 5 г у суткі, замяніць цукразмяшчальныя напоі чыстай пітной вадой, абмежаваць спажыванне прадуктаў з мукі вышэйшага гатунку. Лепш аддаваць перавагу прадуктам з зерня буйнога памолу (авёс, проса, ячмень, полба, кіноа, булгур, грэчка). Штодзённа важна спажываць гародніну і садавіну — не менш за 400 г у суткі (гародніна 3-4 порцыі, садавіна 1-2 порцыі), за выключэннем бульбы. Перавагу лепш аддаваць свежым і мясцовым.

Таксама неабходна абмежаваць спажыванне тлустых сартоў мяса і перапрацаваных прадуктаў, замяніць іх фасоляй, бабовымі, сачавіцай, рыбай, птушкай і нятлустым мясам. Лепш выбіраць ненасычаныя тлушчы, якія змяшчаюцца ў рыбе, авакада, арэхах, алеях — аліўкавым, ільняным, рапсавым.

Важна ўжываць малочныя прадукты з паніжаным утрыманнем тлушчаў. І выкарыстоўваць бяспечны спосаб гатавання ежы: запякаць, гатаваць на пары, варыць. Неабходна выконваць і пітны рэжым. А вось рэзкія, нефізіялагічныя абмежаванні ў харчаванні і галаданне супрацьпаказаны. Пажадана адмовіцца ад шкодных звычак — курэння і алкаголю, спаць не менш за 7 гадзін у суткі, а таксама пазбягаць стрэсавых сітуацый.

Таксама рэкамендуецца фізічная актыўнасць — не менш за 150—300 хвілін у тыдзень аэробнай нагрузкі сярэдняй інтэнсіўнасці (язда на веласіпедзе па роўнай паверхні, хадзьба хуткім крокам, плаванне, праца ў садзе ці ў двары, водная аэробіка) або 75—150 хвілін у тыдзень аэробнай нагрузкі высокай інтэнсіўнасці (бег, хуткая язда на веласіпедзе, плаванне на дыстанцыю, пад'ём у гару). Дадаткова не радзей як два дні на тыдзень пажаданы сілавыя практыкаванні для развіцця мышачнай сілы (адцісканні, практыкаванні на прэс, выкарыстанне эластычных стужак і падыманне цяжараў).

# У ГАСЦЯХ У КОЛАСА

## Пра што гаварылі на круглым стале фестывалю дзіцячай кнігі

**У Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа прайшоў фестываль дзіцячай кнігі «Міхасёвы прыгоды», які музейныя работнікі правялі пры падтрымцы Саюза пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкага дома «Звязда» і Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк горада Мінска.**



Для юных гасцей гэта была выдатная магчымасць пазнаёміцца з сучаснымі пісьменнікамі і нашчадкамі Песняра. Аўтограф-сесіі, віктарыны, майстар-класы, лялечныя спектаклі па народных казках, гульні, якія падрыхтавалі арганізатары, дапамагалі дзецям паглыбіцца ў захапляльны кніжны свет і адкрыць некаторыя сакрэты творцы. Так, падчас музейна-педагагічных заняткаў «Міністр грыбной гаспадаркі» дзеці даведваліся пра адно з захапленняў класіка. Для некаторых юных чытачоў праз гульню пачалося знаёмства з паэмай «Міхасёвы прыгоды» — па сюжэце створана лато.

Калі адгуло дзіцячае свята, музей ператварыўся ў дыскусійную пляцоўку. Пры ўдзеле Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі прайшоў круглы стол, на якім разглядалася пытанне стварэння энцыклапедыі Якуба Коласа. Раней ужо ўбачыла свет падобнае выданне ў трох тамах, прысвечанае Янку Купалу.

Як заўважыла **даследчыца творчасці Коласа, адна з яго ўнучак Вера МІЦКЕВІЧ**, новая энцыклапедыя можа заняць не менш за шэсць тамоў. Тут трэба ўлічыць 1500 твораў класіка, вялікую колькасць дакументальных крыніц. Калі ўзяць толькі эпісталярную спадчыну, можна налічыць каля 150 адрасатаў. Да гэтага часу знаходзяцца новыя інскрыпты — вядома, што Колас падпісваў свае кнігі 120 адрасатам, і ці не кожны год адкрываюцца новыя крыніцы. Ён пражыў больш за Купалу, паспеў наладзіць зносіны з вялікай колькасцю людзей, у тым ліку як дэпутат і як навуковец, у 1929 годзе быў абраны віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук Беларусі.



Безумоўна, каб грунтоўнае энцыклапедычнае выданне, якое абагульніць жыццёвы і творчы шлях класіка, убачыла свет, неабходна аб'яднаць намаганні вялікай колькасці даследчыкаў, прычым гэта могуць быць не толькі літаратуразнаўцы, але і мовазнаўцы, мастацтвазнаўцы. Прычыніцца да пошуку інфармацыі гатовыя музейшчыкі, прадстаўнікі вядучых навучальных устаноў краіны, нашчадкі майстра.

Таксама ўдзельнікі круглага стала пазнаёміліся з інфармацыйна-гістарычным цэнтрам «Міхал Клеафас Агінскі. Жыццё. Лёс. Час» пры лабараторыі Інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук і разгледзелі магчымасць стварэння падобнага віртуальнага рэсурсу, прысвечанага Якубу Коласу.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Новыя кнігі

# СЛОВЫ ДАБРЫНІ І ЛЮБОВІ

## У Выдавецкім доме «Звязда» ўбачыла свет паэтычная кніга Алены БАСІКІРСКАЙ «Мая зямля — яна мая да скону»




**Аўтара добра ведае чытач айчынных масмедыя. Алена Басікірская працуе журналістам у Выдавецкім доме «Беларусь сегодня», шмат піша па пытаннях культуры, сучаснага літаратурнага працэсу, рэцэнзуе кніжныя навінкі.**

*«Свой лёс трымаю, быццам бы ікону. / Мая зямля — яна мая да скону. / Палі, лясы, азёры, пералескі. / Глядзяць у вочы светлыя пралескі. / Мая зямля — яна мая да скону. / Малюся на яе, як на ікону, / Шаную, як прыгожую надзею»*, — такімі радкамі пачынаецца новы паэтычны зборнік маладой пісьменніцы. Натхненне аўтара, яго мастацкія пошукі самым цесным чынам звязаныя з роднай старонкай. Вершы пра Мёры, Мёрскі край, Полацк падаюцца эстэтычным кодам літаратурных і грамадзянскіх перакананняў паэтэсы. «****Цябе, мой край, прырода надзяліла / Адметным і чароўным харастом. / Ты самы гожы, слаўны, светлы, мілы, / Бо сонечным аблашчаны цяплом. / Трываў набегі, войны і расправы/ Ды перажыў нямала перашкод. / Цярпліва-мужным і бясконца правым / Заўсёды выступае твой народ. / Цяпер, мой край, спакойна ў нас пад сонцам, / Мы не ліём крыві і горкіх слёз. / Табою ганаруся я бясконца/ І рада, што з табой з'яднаў нас лёс*», — Алена Басікірская спалучае ў сваім паэтычным веравызнанні цеплыню, дабрыню, светласць жыцця. Колеры яе паэзіі паўстаюць прыцягальнымі, прыязнымі, адкрытымі.

Асобную частку кнігі «Мая зямля — яна мая да скону» складаюць пераклады аўтара. Паэтэса пераўвасобіла на беларускую мову творы Сяргея Ясеніна, Мікалая Клюева, Міхаіла Лермантава, Аляксандра Пушкіна, Фёдара Цютчава, Афанасія Фета, Марыны Цвятаевай, Васіля Чуеўскага, Яўгенія Юр'ева. Зварот да вопыту, літаратурных здзяйсненняў такіх аўтараў патрабуе асаблівай творчай адвагі. І яна ў маладой беларускай паэтэсы абгрунтаваная. Вось як гучаць сусветна вядомыя радкі Афанасія Фета ў беларускім прачытанні Алены Басікірскай: «*Да цябе прыйшоў з вітаннем / Расказаць, што сонца ўстала, / Што яно вільготным раннем / Па лістах затрапятала...*» У раздзеле перакладаў — і чатырнаццаць вершаў, аб'яднаных падзагалоўкам «Паводле Амара Хаяма». Уважлівае знаёмства з параўнальна невялікім абсягам перакладаў Алены Басікірскай пераконвае, што ёй варта часцей выступаць у гэтым часам і няўдзячным мастацкім кірунку. Чужыя творы гучаць натуральна, быццам і напісаны былі па-беларуску. Відавочна, якраз у паэтычным перакладзе гэта і з'яўляецца станоўчай адметнасцю. Будзем спадзявацца, што творца яшчэ неаднойчы звернецца да перакладаў і рускай, і сусветнай класікі. Мастацкі пераклад яднае не толькі паэтаў-адзінак, ён аб'ядноўвае народы і культуры, паўстае выдатным дыпламатам у імя паразумення часам далёкіх рознанацыянальных прастораў. «*І доўга буду тым прыемны я народу, / Што дабрыню душы я лірай абуджаў, / Што ў мой нялёгкі час я ўслаўляў свабоду / І літасць да нябогаў заклікаў. / Загаду Божаму, о муза, будзь пакорнай, / Не бойся крыўды, лаўраў не шукай, / Паклёпы і хвальбу аспрэчвай памяркоўна / І неразумных ты не папракай*». (Аляксандр Пушкін у перакладзе Алены Басікірскай).

Кніга паэзіі «Мая зямля — яна мая да скону» выдадзена па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Сугучча

# 293 СТАРОНКІ АБ ПРЫГОЖЫМ ПІСЬМЕНСТВЕ

## Новыя дарогі да вывучэння беларускай літаратуры ў Кітаі

**Другі Пекінскі інстытут замежных моў ужо не першы год як заявіў сябе той ВНУ, дзе сярод іншых прыярытэтаў — беларусістыка. У гэтай навучальнай установе створаны Цэнтр даследавання беларускай культуры. Менавіта тут складваецца асяродак перакладчыкаў мастацкай літаратуры, якія зазіраюць у беларускі літаратурна-мастацкі свет. З нядаўніх падзей — і стварэнне падручніка па беларускай літаратуры. Наша размова — з аўтарам гэтага творчага, навуковага і, зразумела, адукацыйнага праекта: на пытанні адказвае вучоны і перакладчык Сюй ЧУАНЬХУА.**

***— У Беларусь прыляцела добрая навіна. Вы, паважаны Сюй Чуаньхуа, падрыхтавалі падручнік па беларускай літаратуры... Раскажыце, калі ласка, больш падрабязна пра гэта выданне. Як узнікла яго задума?***

— У нашым інстытуце (Другі Пекінскі інстытут замежных моў) з 2014 года працуе Цэнтр даследавання беларускай культуры, у рамках дзейнасці якога праводзяцца заняткі па вывучэнні беларускай мовы. Дзеля большай эфектыўнасці ў іх арганізацыі з Беларусі быў запрошаны выкладчык, які працуе да сёння. З часам мы зразумелі, што кітайскім студэнтам варта пазнаёміцца менавіта з сучаснай беларускай літаратурай. Мы ведалі, што некаторыя класічныя творы беларускай літаратуры ўжо перакладзены на кітайскую мову нашмат раней і пры жаданні іх можна знайсці ў бібліятэках. Таму мы хацелі б звярнуць увагу студэнцкай моладзі якраз на сучасных празаікаў, паэтаў Беларусі...




Кандыдат гістарычных навук Дар'я Зубко, якая прыехала з Мінска, дапамагла звязацца з многімі сучаснымі беларускімі аўтарамі. Мы вельмі ўважліва падбіралі матэрыялы. Найперш кіраваліся зацікаўленнямі сённяшніх студэнтаў, іх уяўленнямі пра віды і жанры літаратуры ўвогуле. Вось гэтыя акалічнасці і паўплывалі на тое, каб стварыць падручнік па беларускай літаратуры. Ён складзены такім чынам, што на старонках выдання размешчана інфармацыя пра аўтараў, поруч ідуць тэксты таго ці іншага пісьменніка.

***— Вы спалучылі крытычны разгляд і хрэстаматыю?***

— Можна і так сказаць. Было адно галоўнае жаданне — паказаць краіну праз сучасныя творы, адлюстраваць шлях, якім ідзе сучасны беларускі літаратурны працэс.

***— Што з сябе ўяўляе выданне па сваіх вонкавых характарыстыках? Колькі ў падручніка старонак? Ці ёсць у кнізе ілюстрацыі? Ці пададзена ў ёй бібліяграфія твораў, публікацый беларускіх пісьменнікаў?***

— У дадзеным падручніку 293 старонкі. Ёсць і біяграфіі аўтараў з іх фотаздымкамі. Невялікія апавяданні прадстаўлены ў поўным аб'ёме, а вось раманы і аповесці — толькі ўрыўкамі. Аднак у біяграфічнай частцы раздзела, прысвечанага таму ці іншаму аўтару, паказаны спасылкі на сайты, дзе з творчасцю пісьменнікаў, самімі мастацкімі тэкстамі можна пазнаёміцца даволі грунтоўна, у поўным аб'ёме. Завяршае кожны раздзел тэкст, так бы мовіць, метадычнага характару, з дапамогай якога можна замацаваць тэму, падсумаваць вывучэнне творчасці таго ці іншага пісьменніка. Уключана ў гэтую завяршальную частку і некалькі пытанняў, што дапамагаюць развіць кампаратывістычныя памкненні, дазваляюць студэнтам параўнаць беларускіх творцаў з празаікамі і паэтамі Кітая. Гэтая адметнасць падштурхоўвае да параўнальнага аналізу твораў, падводзіць маладых людзей да выбару далейшых навуковых, даследчыцкіх зацікаўленняў.

***— У 1950—1960-я гады і ў наступныя дзесяцігоддзі ў Кітаі было выдадзена звыш 60 асобных кніг беларускіх паэтаў, празаікаў, драматургаў. Зразумела, у перакладзе на кітайскую мову. Гаворка — пра творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Аркадзя Куляшова, Кандрата Крапівы, Максіма Танка, Івана Шамякіна, Янкі Маўра... А які часавы адрэзак вы абралі? Ці ўлічвалі ўжо раней адкрытых кітайскім чытачом беларускіх пісьменнікаў?***

— Мы стараліся не расказваць уж вядомае... Таму якраз у нашым выданні, якое, паўтаруся, мы характарызуем найперш як падручнік менавіта па сучаснай беларускай літаратуры, шмат іншых імёнаў... Пэўны часавы адрэзак мы не бралі. Разглядаем творчасць пісьменнікаў, якія пішуць і па-беларуску, і па-руску. Мы імкнуліся звярнуць увагу на ўсе кірункі ў сучаснай беларускай літаратуры. У падручніку — літаратурна-крытычныя характарыстыкі, а таксама творы пятнаццаці аўтараў: тут прадстаўлены Людміла Рублеўская, Віктар Шніп, Валянціна Паліканіна, Міхась Пазнякоў, Наталля Батракова, Алесь Бадак, Адам Глобус, Андрэй Федарэнка, Навум Гальпяровіч, Мікола Мятліцкі і іншыя. Наш выбар характарызуе і жанравае шматаблічча ў сучасным літпрацэсе ў Беларусі...

***— Працуючы над падручнікам, вы карысталіся крыніцазнаўствам толькі на рускай мове? Былі ў полі вашага зроку работы беларускіх літаратуразнаўцаў, беларускіх літаратурных крытыкаў?***

— Мы не абмежаваліся ў выбары саміх мастацкіх твораў публікацыямі на рускай мове. Перад вачыма былі і арыгінальныя публікацыі на беларускай. Заўважу, што некаторыя аўтары пасля нашых перагавораў спецыяльна для нашага выдання зрабілі пераклады на рускую мову.

***— На каго з чытачоў вы арыентаваліся, працуючы над стварэннем кітайскага падручніка па беларускай літаратуры?***

— У першую чаргу на студэнтаў, якія вывучаюць рускую і беларускую мовы.

***— Вы падрыхтавалі і анлайн-лекцыю па беларускай літаратуры. Каму яна адрасавана? Ці распаўсюджваецца дадзеная лекцыя ў сацыяльных сетках?***

— Так, падрыхтавана анлайн-лекцыя, яна адрасавана студэнтам, якія вывучаюць рускую і беларускую мовы. Лекцыя будзе распаўсюджвацца на спецыялізаваных сайтах з магчымасцю азнаямлення ўсім жадаючым.

***— Дзякуй вялікі, паважаны Сюй Чуаньхуа, за тое, што пагадзіліся адказаць на пытанні для нашага выдання. Спадзяёмся, што працэс вывучэння беларускай літаратуры і ў Другім Пекінскім інстытуце замежных моў, і ўвогуле ў ВНУ Кітая набудзе шырокую распаўсюджанасць.***

— І я таксама вельмі на гэта спадзяюся!..

**Гутарыў Мікола БЕРЛЕЖ.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества унитарного предприятия «Вилейское СМУ ОАО «Минскводстрой»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Труба круглая 426х22,7 м | 672,00 | 67,20 | 33,60 |
| 2 | МФУ CANON IR 2520 инсталлир. с двусторонним податчиком оригиналов AB1 3796B003, инв. № 202 | 720,00 | 72,00 | 36,00 |
| 3 | Компрессор винтовой CSD 85T8.5бар 400/50EU, инв. № 187 | 20 100,00 | 2010,00 | 1005,00 |
| 4 | Станок токарно-винторезный РТ-21002, инв. № 200 | 3000,00 | 300,00 | 150,00 |
| 5 | Ножницы комб., инв. № 50 | 1296,00 | 129,60 | 64,80 |
| 6 | Персональный компьютер, инв. № 157 | 9,36 | 0,94 | 0,47 |
| 7 | Мотопомпа бензиновая высоконапорная SERM50VBAA, инв. № 143 | 525,60 | 52,56 | 26,28 |
| 8 | Мотопомпа бензиновая высоконапорная SERM50VBAA, инв. № 206 | 525,60 | 52,56 | 26,28 |
| 9 | Машина сверлильная на э/м основании МС8+, инв. № 183 | 230,40 | 23,04 | 11,52 |
| 10 | Автомобиль ГАЗ- 32213-408 сл. кузов, инв. № VIL00208 | 2232,00 | 223,20 | 111,60 |
| 11 | Инструменталка, инв. № 109 | 612,00 | 61,20 | 30,60 |
| 12 | Трансформатор ТДМ-403, инв. № 93 | 61,20 | 6,12 | 3,06 |
| 13 | Автомобиль ГАЗ 32213-414, инв. № 62 | 720,00 | 72,00 | 36,00 |
| 14 | Инструменталка, инв. № 116 | 612,00 | 61,20 | 30,60 |
| 15 | Бензопила Штиль MS 250 (без цепи и шины), инв. № 186 | 216,00 | 21,60 | 10,80 |
| 16 | Инструменталка, инв. № 126 | 612,00 | 61,20 | 30,60 |
| 17 | Полуавтомат для сварки инверторный MIG500A/MMA, инв. № 203 | 1080,00 | 108,00 | 54,00 |
| 18 | Автомобиль ГАЗ 32213-244 X96322130D0762983, инв. № 197 | 2952,00 | 295,20 | 147,60 |
| 19 | Холодильник МХМ-2808-90. сер-т BY/112 03/06/002, инв. № 139 | 158,40 | 15,84 | 7,92 |
| 20 | Сварочный бензиновый генератор WAGT 220DC HCB, инв. № 130 | 316,80 | 31,68 | 15,84 |
| 21 | Трансформатор свар.ТДМ252 (380В, плав. регул. 50-250А), инв. № 121 | 115,20 | 11,52 | 5,76 |
| 22 | Станок гор-фрез 6М82Г, инв. № 230 | 2088,00 | 208,80 | 104,40 |
| 23 | Станок ток-винт 1В62Г, инв. № 231 | 3096,00 | 309,60 | 154,80 |
| 24 | Станок верт-сверл 2Н135, инв. № 233 | 2376,00 | 237,60 | 118,80 |
| 25 | Выпрямитель ВДГ-303, инв. № 81 | 129,60 | 12,96 | 6,48 |
| 26 | Станок попер-стр 7Б35, инв. № 236 | 1656,00 | 165,60 | 82,80 |
| 27 | Сканер CANON 400 2996C010, инв. № 218 | 216,00 | 21,60 | 10,80 |
| 28 | Ножницы НБ-318, инв. № 243 | 2088,00 | 208,80 | 104,40 |
| 29 | Настольно-сверлильный станок 2М112, инв. № 244 | 504,00 | 50,40 | 25,20 |
| 30 | Агрегат сварочный (САК), инв. № 103 | 1080,00 | 108,00 | 54,00 |
| 31 | Монитор ЖКИ, инв. № 70 | 21,60 | 2,16 | 1,08 |
| 32 | Сварочный полуавтомат ПДГ-354, инв. № 115 | 504,00 | 50,40 | 25,20 |
| 33 | Окрасочный агрегат 650 на колесиках со шлангом 3/8, поводок 1/4 и держателем XHD, инв. № 216 | 864,00 | 86,40 | 43,20 |
| 34 | Многофункциональное устройство CANON MF-4450, инв. № 152 | 108,00 | 10,80 | 5,40 |
| 35 | Монитор LCD Philips, инв. № 100 | 21,60 | 2,16 | 1,08 |
| 36 | Принтер Phaser 3150, инв. № 79 | 47,52 | 4,75 | 2,38 |
| 37 | Сварочный генератор WAGT 220DC HSB, инв. № 140 | 424,80 | 42,48 | 21,24 |
| 38 | Персональный компъютер, инв. № 165 | 9,36 | 0,94 | 0,47 |
| 39 | WK330EA ноутбук HP Probook 4520s i333M 15 4GB/500, инв. № 149 | 115,20 | 11,52 | 5,76 |
| 40 | Компъютер без монитора, инв. № 88 | 9,36 | 0,94 | 0,47 |
| 41 | Монитор ЖК, инв. № 89 | 21,60 | 2,16 | 1,08 |
| 42 | Под. мех. ПДГ-312, инв. № 43 | 122,40 | 12,24 | 6,12 |
| 43 | Выпрямитель ВДГ 303-3, инв. № 44 | 129,60 | 12,96 | 6,48 |
| 44 | Кунг К-375 №01115, инв. № 128 | 633,60 | 63,36 | 31,68 |
| 45 | Сварочный трансформатор ТДМ-405 (380В, AI) № BY/112 03, инв. № 136 | 38,16 | 3,82 | 1,91 |
| 46 | Автомобиль ГАЗ-32213, инв. № 48 | 2952,00 | 295,20 | 147,60 |
| 47 | Монитор LCD Philips, инв. № 99 | 21,60 | 2,16 | 1,08 |

В отношении лотов №№ 1-4 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 50 %.**
Ранее публикация о торгах размещалась в газете «Звязда» № 252 (29874) от 23.12.2022, стр. 14, № 21 (29901) от 02.02.2023, стр. 10, № 55 (29935) от 23.03.2023, стр. 15, № 75 (29955) от 20.04.2023, стр. 10, № 91 (29971) от 16.05.2023, стр. 10.
